# Дзіцячыя бібліятэкі

Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

2022



**ДЗІЦЯЧЫЯ БІБЛІЯТЭКІ. 2022**

Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

Складальнік **Пчалова** Ірына Мікалаеўна
Адказны за выпуск Т. М. Адамян
Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай
Мастацкае афармленне А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ ”Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна“
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»
Аддзел бібліятэказнаўства

# ДЗІЦЯЧЫЯ БІБЛІЯТЭКІ. 2022

*Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь*

Віцебск, 2023

УДК 027.84
ББК 78.347.241 (4Беи-4Вит)
Д43

Складальнік *І. М. Пчалова*
Рэдакцыйная калегія: *Н. А. Пугачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Дзіцячыя бібліятэкі. 2022 : інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь / ДУ ”Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна“, Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. І. М. Пчалова]. – Віцебск, 2023. – 52 с.

У выданні прадстаўлены агляд дзейнасці дзіцячых бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры ў Віцебскай вобласці за 2022 год. У табліцах прадстаўлены статыстычныя дадзеныя і адносныя паказчыкі іх дзейнасці.

Выданне прызначана для бібліятэчных работнікаў, кіраўнікоў органаў кіравання культурай, а таксама ўсіх, хто цікавіцца развіццём бібліятэчнай справы ў вобласці.

© ДУ ”Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна“, 2023

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | арганізацыя вольнага часу | |
| 62 | | **”Книжный сад“** *(праграма)* | літаратурны | 2022–2025 |
| 63 | | **”Тебе о праве и право о тебе“** *(праект)* | прававы | 2021–2022 |
| 64 | | **”Правила движения достойны уважения“** *(праект)* | прававы | 2021–2022 |
| 65 | | **”Работать творчески, отдыхать активно, жить долго“** *(праект)* | здаровы лад жыцця | 2021– |
| 66 | | **”Расцем разам з беларускай кнігай“** *(праект)* | літаратурны | 2022 |
| 67 | | **”Да лепшых скарбаў дакраніся“** *(праект)* | папулярызацыя беларускай культуры | 2018–2022 |
| 68 | | **”Литературные каникулы – 2022“** *(праект)* | дасугавы | 2022 |
| 69 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А.С. Пушкіна | **”Пушкин – XXI век – Новополоцк“** *(праграма)* | літаратурны | 2016– |
| 70 | | **”Солнышко“** *(праграма)* | шмат-профільны (у дапамогу сацыяльнаму прытулку) | 2003– |
| 71 | | **”Росток“** *(праграма)* | шмат-профільны (у дапамогу дашкольным установам) | 2006– |
| 72 | | **”Беларуская чытанка“** *(праект)* | папулярызацыя беларускай культуры | 2021–2023 |
| 73 | | **”Читаем. Учимся. Играем“** *(праект)* | дасугавы | 2020–2022 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 47 | Новалукомльская дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 | **”ПУП“** (Познавательно. Увлекательно. Полезно) *(праграма)* | навукова-пазнавальны | 2021–2022 |
| **Шаркаўшчынская ЦБС** | | | | |
| 48 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | **”Сэрцам адданыя роднай зямлі“** *(праект)* | патрыятычны | 2022–2025 |
| 49 | | **”Истории одного лета“** *(праект)* | дасугавы | 2022 |
| **ЦБС г. Віцебска** | | | | |
| 50 | Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча | **”Нам засталася спадчына“** *(праграма)* | краязнаўчы | 2000– |
| 51 | | **”Радзіма мая дарагая, красуйся і ў шчасці жыві!“** (рэалізуецца разам з Першамайскай раённай арганізацыяй г. Віцебска ”Беларускае грамадскае аб’яднанне ветэранаў“) *(праект)* | патрыятычны | 2022 |
| 52 | Бібліятэка-філіял № 11 імя М. Лынькова | **”Усё пачынаецца з сям’і“** *(праграма)* | сямейнае выхаванне | 2006– |
| 53 | | **”Листая страницы календаря“** *(анлайн-праект)* | адукацыйны | 2022 |
| 54 | | **”Аленький цветочек“** *(праект)* | літаратурна-эстэтычны | 2022 |
| 55 | Бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака | **”Увайсці ў свет прыгажосці“** *(праграма)* | эстэтычны | 2016– |
| 56 | | **”Доброе сердце“** *(праект)* | дасугавы | 2022 |
| 57 | | **”Через театр кукол – в мир книги!“** *(праект)* | літаратурны | 2022 |
| **ЦБС г. Наваполацка** | | | | |
| 58 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака | **”Дети. Экология. Книга“** – экалагічна-інфармацыйны цэнтр *(праграма)* | экалагічны | 2004– |
| 59 | | **”Кругозор“** *(праграма)* | інфармацыйны | 2009– |
| 60 | | **”К книге – через театр кукол“** *(праграма)* | літаратурна-эстэтычны | 2019–2023 |
| 61 | | **”Дорога добра“** *(праграма)* | сацыяльная рэабілітацыя дзяцей-інвалідаў, | 2020–2023 |



# ЗМЕСТ

**АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗМЕСТ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ДЗІЦЯЧЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2022 ГОДЗЕ** **4**

**САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ. ФОТАФАКТ** **24**

**ДАДАТКІ** **28**

Дадатак 1. Дзіцячыя бібліятэкі Віцебскай вобласці 28

Дадатак 2. Асноўныя паказчыкі дзейнасці дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці за 2022 год 30

*Карыстальнікі* 30

*Дакументавыдача* 31

*Наведванні* 32

*Бібліятэчны фонд* 33

*Адносныя паказчыкі. Кадры* 34

Дадатак 3. Кантактныя дадзеныя 35

Дадатак 4. Сацыякультурная дзейнасць 39

Дадатак 5. Прадстаўніцтвы дзіцячых бібліятэк у сацыяльных сетках 40

Дадатак 6. Клубы, гурткі і аматарскія аб’яднанні 43

Дадатак 7. Лялечныя тэатры, тэатры кнігі 46

Дадатак 8. Мэтавыя праграмы (праекты) 47

## АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗМЕСТ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ДЗІЦЯЧЫХ БІБЛІЯТЭК ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 2022 ГОДЗЕ

Па стане на 01.01.2023 года абслугоўваннем дзяцей і падлеткаў у Віцебскай вобласці займаюцца 26 дзіцячых бібліятэк. За 2022 год сетка дзіцячых бібліятэк скарацілася на 1 адзінку (на 01.01.2022 – 27). Раённая дзіцячая бібліятэка (філіял № 1) Расонскай ЦБС далучана да Расонскай раённай бібліятэкі з 01.08.2022 года рашэннем Расонскага РВК № 394 ад 29.07.2022 г. Таксама, абслугоўваннем дзіцячага карыстальніка займаюцца абласная бібліятэка, 23 цэнтральныя бібліятэкі, 32 гарадскія, 19 гарпасялковых і 291 сельскія бібліятэкі.

Самымі галоўнымі напрамкамі дзейнасці дзіцячых бібліятэк у 2022 годзе сталі выкананне дзяржаўнай праграмы ”Культура Беларусі“ на 2021–2025 гады (зацверджана пастановай Савета Міністраў ад 29.01.2021 г. № 53), выкананне плана мерапрыемстваў па правядзенні Года гістарычнай памяці (адпаведна Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 1 ад 01.01.2022 г. ”Аб аб’яўленні 2022 года Годам гістарычнай памяці“), а таксама:

– фарміраванне грамадзянскай адказнасці і патрыятызму;

– раскрыццё асноў здаровага ладу жыцця, павышэнне духоўна-маральнага развіцця моладзі;

– рэалізацыя культурна-асветніцкай місіі дзіцячых бібліятэк, прыцягненне ўвагі да падзей у культурным асяроддзі Віцебшчыны;

– удасканаленне даступнасці бібліятэчных рэсурсаў, адкрытасць да інавацый, якасць і аператыўнасць у прадастаўленні паслуг, стварэнне краязнаўчых электронных інфармацыйных рэсурсаў;

– павышэнне прэстыжу чытання, пашырэнне чытацкай аўдыторыі;

– развіццё дзіцячых бібліятэк як інфармацыйнага і культурна-асветніцкага цэнтра, адкрытага для сустрэч, зносін, правядзення інтэлектуальнага і вольнага часу;

– рэалізацыя мэтавых праграм і творчых праектаў з мэтай паспяховай сацыялізацыі дзяцей і падлеткаў;

– праца з карыстальнікамі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя і дзяцьмі, якія засталіся без апекі бацькоў.

На падставе статыстычных дадзеных аб сацыяльна-эканамічным становішчы Віцебскай вобласці на 1 студзеня 2022 года колькасць дзяцей ва ўзросце да 15 год склала **167 573** чалавек, або **15,2**% ад агульнай колькасці насельніцтва (**1 103 833**).

Паслугамі дзіцячых бібліятэк у 2022 годдзе карысталася **73 378** чалавек, што ў працэнтных суадносінах склала **43,8**% (у 2021 годзе – 76 236; 2020 – 77 900). Доля дзіцячай чытацкай аўдыторыі ва ўзросце да 15 год



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | **Полацкая РЦБС** | | |
| 31 | Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 | **”Времена. События. Судьбы“** *(праграма)* | патрыятычны | 2022 |
| 32 | | **”У книги не бывает каникул“** *(праграма)* | інфармацыйна-асветніцкі | 2022 |
| 33 | | **”Аз і Букі беларускай культуры“** *(праграма)* | папулярызацыя нацыянальнай культуры, мовы, літаратуры | 2022 |
| 34 | | **”Мы за здоровый образ жизни!“** *(праграма)* | здаровы лад жыцця | 2022 |
| 35 | | **”В гостях у Мэри Поппинс“** *(праграма)* | эстэтычны | 2022 |
| 36 | | **”Ступеньки“** *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2022 |
| 37 | | **”Расти в безопасности“** *(праграма)* | прававы | 2022 |
| 38 | | **”Закон изучают дети“** *(праграма)* | прававы | 2022 |
| 39 | | **”БиблиоPUZZLE“** *(праект)* | цэнтр чытання і актыўнай творчасці | 2022–2023 |
| 40 | | **”Веселое Новогодье“** *(праект)* | дасугавы | 2022–2023 |
| | | **Пастаўская ЦБС** | | |
| 41 | Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі – філіял № 1 | **”Детишки + книжки“** *(праект)* | адукацыйны | 2022–2024 |
| 42 | | **”Радасць“** *(праект)* | літаратурна-мастацкі | 2022 |
| | | **Сенненская ЦБС** | | |
| 43 | Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1 | **”Міласэрнасць“** *(праект)* | сацыяльная рэабілітацыя дзяцей-інвалідаў, арганізацыя вольнага часу | 2020–2022 |
| | | **Талачынская ЦБС** | | |
| 44 | Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 | **”Любім кнігі мы чытаць, у гульні розныя гуляць“** *(праграма)* | літаратурны | 2022 |
| | | **Чашніцкая ЦБС** | | |
| 45 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | **”Свет вакол нас“** *(праграма)* | экалагічны | 2021–2022 |
| 46 | | **”Па кніжнаму мору пад ветразем лета“** *(праект)* | дасугавы | 2022 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 14 | | **”Літаратурная кругасветка“** *(праект)* | папулярызацыя чытання | 2022 |
| 15 | | **”Свежая прэса“** *(праект)* | папулярызацыя чытання | 2022 |
| 16 | | **”Бібліякаляндар ”Цікава кожны дзень“** *(праект)* | папулярызацыя чытання | 2022 |
| 17 | | **”Бібліяпрадлёнка“** *(праект)* | дасугавы | 2022 |
| **Лепельская ЦБС** | | | | |
| 18 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | **”Здоровый образ жизни – это здорово!“** *(праграма)* | здаровы лад жыцця | 2017–2022 |
| 19 | | **”Библиопродленка “ЗОО-знакомство”“** *(праграма)* | дасугавы | 2022 |
| 20 | | **”Раз, два, три, четыре, пять – летом некогда скучать“** *(праграма)* | дасугавы | 2022 |
| 21 | | **”МЧС спешит в библиотеку“** *(праект)* | здаровы лад жыцця | 2022 |
| **Мёрская ЦБС** | | | | |
| 22 | Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка | **”Спадчына“** *(праграма)* | краязнаўчы | 2021–2025 |
| 23 | | **”Экалогія ад А да Я“** *(праграма)* | экалагічны | 2021–2025 |
| **Аршанская ЦБС** | | | | |
| 24 | Дзіцячая бібліятэка імя У.С. Караткевіча – філіял № 1 | **”Книжная Вселенная“** *(праграма)* | літаратурны | 2014–2025 |
| 25 | | **”Ступеньки в мир прекрасного“** *(праграма)* | музычна-эстэтычны | 2017–2025 |
| 26 | | **”Відэаэнцыклапедыі“** *(праект)* | краязнаўчы | 2022 |
| 27 | | **”Большие открытия маленьких коллекций“** *(праект)* | выставачная дзейнаць | 2022 |
| 28 | | **”Казачны каляндар“** *(праект)* | культурна-адукацыйны | 2022 |
| 29 | Дзіцячая бібліятэка імя Н.К. Крупскай – філіял № 8 | **”Территория безопасного детства“** *(праект)* | адукацыйны | 2022 |
| 30 | | **”Славен город делами – славен город людьми“** *(праект)* | літаратурна-краязнаўчы | 2022 |



склала **61 852** чытачоў (у 2021 годзе – 63 877; 2020 – 65 439). Карыстальнікам было выдадзена **1 250 562** экзэмпляраў дакументаў (у 2021 годзе – 1 321 546 экз.; 2020 – 1 353 709 экз.).

У 2022 годзе колькасць наведванняў склала **546 762** адзінкі (у 2021 годзе – 547 564 адзінак; 2020 – 585 975 адзінак). Працэнт выканання планавага паказчыка па наведваннях дзіцячымі бібліятэкамі Віцебскай вобласці быў выкананы на ўзроўні **101,2**%. Па выніках справаздачнага года актыўнасць наведвання (наведвальнасць) склала **7,5** (у 2021 годзе – 7,2; 2020 – 7,5), чытальнасць – **17,0** (у 2021 годзе – 17,5; 2020 – 17,4), абарачальнасць фонду – **1,5** (у 2021 годзе – 1,6; 2020 – 1,5).

Планавыя паказчыкі работы дзіцячых бібліятэк па вобласці былі выкананы. Разам з тым, тэндэнцыя да зніжэння колькасці чытачоў, кнігавыдач і наведванняў захоўваецца. Змяншэнне колькасці насельніцтва і аптымізацыя ўстаноў культуры – аб’ектыўныя прычыны зніжэння планавых паказчыкаў работы дзіцячых бібліятэк.

У 2022 годзе агульны аб’ём новых паступленняў у фонды дзіцячых бібліятэк вобласці склаў **26 096** асобнікаў (у 2021 годзе – 27 296, 2020 – 25 417). У сярэднім кожная бібліятэка за справаздачны год атрымала каля тысячы экзэмпляраў дакументаў. Доля выбыцця выданняў з агульнага фонду дзіцячых бібліятэк склала **46 851** экз. дакументаў (у 2021 годзе – 28 922; 2020 – 35 254). Сукупны аб’ём фонду дзіцячых бібліятэк на 01.01.2022 года склаў **811 540** дакументаў (у 2021 годзе – 830 860; 2020 – 885 054). У сярэднім фонд адной бібліятэкі склаў **31,2** тыс. экз. дакументаў. Кнігазабяспечанасць у разліку на аднаго карыстальніка дзіцячых бібліятэк склала **11** экз. дакументаў. Абнаўленне фонду ў 2022 годзе склала ў сярэднім **3,2**%. Падтрымліваць інфармацыйны патэнцыял і прываблiваць юных наведвальнікаў дзіцячым бібліятэкам дапамагае падпіска на перыядычныя выданні. Усяго ў справаздачным годзе было выпісана ў сярэднім 21 назва на 1 установу.

Па выніках 2022 года персанальнымі камп’ютарамі забяспечаны **26** дзіцячых бібліятэк вобласці (100% камп’ютарызацыя). Агульная колькасць камп’ютараў склала **87** адзінак. У сярэднім па вобласці на 1 дзіцячую бібліятэку прыходзіцца **3,3** камп’ютары. Доступ да інтэрнэту і электронную пошту маюць **25** дзіцячых бібліятэк. Па-ранейшаму не мае выхад у інтэрнэт дзіцячая бібліятэка Шумілінскай ЦБС.

Свае прадстаўніцтвы ў сацыяльных сетках маюць **73**% дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці. Не працуюць у сацыяльных сетках 7 бібліятэк (Дзіцячая бібліятэка Браслаўскай ЦБС, Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1, Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1, Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 Талачынскай ЦБС, Новалукомльская дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 Чашніцкай РЦБС, Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Шаркаўшчынскай ЦБС, Бібліятэка-філіял № 10 імя Я. Коласа ЦБС г. Віцебска). Па-ранейшаму найбольшай папулярнасцю карыстаюцца сацыяльныя сеткі ”ВКонтакте“ (зарэгістравана 18 бібліятэк), ”Одноклассники“ (зарэгістравана 4 бібліятэкі) і Instagram (зарэгістравана 9 бібліятэк). Докшыцкая дзіцячая бібліятэка мае свой

уласны інтэрнэт-сайт (http://det.doklibrary.by/index.php/ru/), і 9 дзіцячых старонак размешчана на вэб-сайтах бібліятэчных сістэм: Бешанковіцкай, Верхнядзвінскай, Гарадоцкай, Глыбоцкай, Лёзненскай, Мёрскай, Пастаўскай, Сенненскай, Ушацкай, Шумілінскай ЦБС і ЦБС г. Наваполацка.

У 2022 годзе ў дзіцячых бібліятэках Віцебскай вобласці працавала **120** бібліятэчных спецыялістаў (у 2021 годзе – 120 спецыялістаў, 2020 – 132 спецыялісты). Вышэйшую бібліятэчную адукацыю маюць **43** супрацоўніка (у 2021 – 47, 2020 – 50), сярэднюю спецыяльную адукацыю маюць **38** супрацоўнікаў (у 2021 – 41, 2020 – 47).

У справаздачным годзе палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 3 імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка. За бюджэтныя сродкі ўласнымі сіламі быў праведзены бягучы рамонт і пафарбаваны аконныя рамы. Зроблены рамонт, афарбоўка цоколя будынка, а таксама ўстаноўлена стойкі для веласіпедаў у дзіцячай бібліятэцы-філіяле № 1 Чашніцкай РЦБС.

Рэжым работы дзіцячых бібліятэк устаноўлены з улікам занятасці дзяцей у школе. У асноўным абслугоўванне карыстальнікаў забяспечваецца да 19.00 (20 бібліятэк), да 18.30 працуе Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1, да 18.00 працуюць 5 бібліятэк. З іх максімальная колькасць адкрыта для карыстальнікаў у суботу і нядзелю.

2022 год стаў багаты на юбілейныя даты. Так, 11 дзіцячых бібліятэк адзначылі свае знамянальныя даты на працягу года. **75-годдзе** адсвяткавалі дзіцячая бібліятэка Шумілінскай ЦБС, Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Чашніцкай РЦБС; **70-годдзе** адзначылі Дзіцячая раённая бібліятэка Бешанковіцкай ЦБС, Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Докшыцкай ЦБС, Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 Полацкай РЦБС, Раённая дзіцячая бібліятэка (філіял № 1) Расонскай ЦБС, Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 Талачынскай ЦБС, аддзел па рабоце з дзецьмі Лёзненскай ЦБС; **65-годдзе** адсвяткавала Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 Глыбоцкай ЦБС; **55-годдзе** адзначыла бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Віцебска; **45-годдзе** – Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска.

Па выніках справаздачнага года былі адзначаны прафесійныя дасягненні супрацоўнікаў дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці: *Жана Палітава*, загадчык дзіцячай бібліятэкі імя Н. Крупскай Аршанскай ЦБС, атрымала Падзяку Упраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта; Ганаровай граматай Наваполацкага гарадскога Савета дэпутатаў была адзначана *Таццяна Варанец*, загадчык дзіцячай бібліятэкі імя А. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка. Не засталася па-за ўвагай і плённая дзейнасць саміх устаноў культуры. Так, калектыў *дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 1 Шаркаўшчынскай ЦБС* быў занесены на Дошку гонару Шаркаўшчынскага раёна па выніках работы за 2021 год. Прэмія Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва ў намінацыі ”Лепшая дзіцячая бібліятэка“ па





## Мэтавыя праграмы (праекты)

| № | Бібліятэка | Назва праграмы | Напрамак дзейнасці | Тэрміны дзеяння |
|---|---|---|---|---|
| | | **Бешанковіцкая ЦБС** | | |
| 1 | Філіял ”Дзіцячая раённая бібліятэка“ | **”Чарадзейная скарбока“** *(праграма)* | папулярызацыя беларускай культуры | 2013–2022 |
| 2 | | **”Чтоб не скучно было летом, мы идём в библиотеку“** *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2022 |
| 3 | | **”Абразкі з жыцця нашых продкаў“** *(праект)* | краязнаўчы | 2022 |
| 4 | | **”Дружат книга и кино“** *(праект)* | мастацка-літаратурны | 2022 |
| | | **Браслаўская ЦБС** | | |
| 5 | Дзіцячая бібліятэка | Духоўна-асветніцкі праект **”Святыні браслаўскай зямлі“** | духоўна-асветніцкі | 2021–2022 |
| 6 | | Краязнаўча-пошукавы праект **”Браслаў: тут мінуўшчына з сучаснасцю сышліся“** | гісторыка-краязнаўчы | 2021–2022 |
| | | **Верхнядзвінская ЦБС** | | |
| 7 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | **”В судьбе природы – наша судьба“** *(праграма)* | экалагічны | 2022–2023 |
| | | **Глыбоцкая ЦБС** | | |
| 8 | Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | Праграма **”Через книгу – к духовному возрождению“** *(праграма)* | духоўны | 2020–2022 |
| 9 | | **”Через книгу в мир природы“** *(праграма)* | экалагічны | 2019–2022 |
| 10 | Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 | **”Першы крок да кнігі“** *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2020–2022 |
| | | **Докшыцкая ЦБС** | | |
| 11 | Докшыцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | **”ЛУЧ“** (Лучшее учение – чтение) *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2010–2022 |
| 12 | | **”Книжная круговерть“** *(праграма)* | папулярызацыя чытання | 2022 |
| 13 | | **”Шаг вперёд“** *(праект)* | прававы | 2021–2022 |

## Лялечныя тэатры, тэатры кнігі

| № | Рэгіён | Назва | Ство-раны | Бібліятэка |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Сянно | Народны лялечны тэатр кнігі **”Пятрушка“** | 1996 | Раённая дзіцячая бібліятэка |
| 2 | Бешанковічы | **”Театр кнігі Васі Вясёлкіна“** | 2014 | Філіял ”Вярхоўская сельская бібліятэка“ |
| 3 | | Тэатр кнігі **”Чарадзеі“** | 2010 | Філіял ”Астровенская сельская бібліятэка“ |
| 4 | Гарадок | **”Колобок и компания“** | 2005 | Аддзел дзіцячай і юнацкай літаратуры ЦРБ |
| 5 | | **”Сказочный теремок“** | 2020 | Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка |
| 6 | Дуброўна | **”Золушка“** | 2020 | Філіял ”Рэдзькаўская сельская бібліятэка-клуб“ |
| 7 | Лепель | **”Ларец сказок“** | 1987 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 |
| 8 | Орша | **”Карусель“** | 2011 | Дзіцячая бібліятэка Імя У. Караткевіча |
| 9 | | Тэатр-батлейка **”Лялькі“** | 2007 | Бібліятэка-філіял № 2 імя М. Горкага |
| 10 | | **”Церамок“** | 2008 | Бабініцкая сельская бібліятэка-філіял № 54 |
| 11 | Полацк | **”Вясёлка“** | 2003 | Багатырская бібліятэка-філіял № 48 |
| 12 | | **”Церамок“** | 2002 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 6 імя Я. Журбы |
| 13 | Талачын | **”Куфэрак“** | 2006 | Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 |



выніках работы за 2022 год была прысуджана *раённай дзіцячай бібліятэцы імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС*.

Дзіцячыя бібліятэкі актыўна працавалі па мэтавых праграмах і творчых праектах, тэматыка якіх адпавядала актуальным патрабаванням часу. На працягу 2022 года бібліятэкі ажыццявілі **37** праграм і **36** праектаў для дзяцей і падлеткаў. Удалымі прыкладамі бібліятэчных праектаў 2022 года сталі: *”МЧС спешит в библиотеку“* (**дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 Лепельскай ЦБС**), *”Радасць“* (**раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС**), *”Радзіма мая дарагая, красуйся і ў шчасці жыві!“* (**бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска**), *”Расцём разам з беларускай кнігай“* (**дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка**).

Менавіта дасугавая дзейнасць часта вызначае твар бібліятэкі, садзейнічае фарміраванню яе станоўчага іміджу. Рэалізацыі гэтай функцыі шмат у чым спрыяюць клубы і аматарскія аб’яднанні. У 2022 годзе пры публічных бібліятэках Віцебскай вобласці ажыццяўлялі працу **205** клубных фарміраванняў для дзяцей і падлеткаў, у якіх было занята звыш за **2,4** тысячы непаўналетніх ва ўзросце ад 4 да 15 год. Пры дзіцячых бібліятэках працаваў **31** клуб з агульнай колькасць удзельнікаў – **575**. Усе мерапрыемствы звычайна праводзяцца ў пазаўрочны, канікулярны час і выхадныя дні для максімальнай занятасці дзяцей – членаў клубаў па інтарэсах. На базе бібліятэк г. Віцебска і Віцебскай вобласці функцыянуе **13 лялечных тэатраў**, сярод якіх можна вылучыць 1 тэатр-батлейку і 3 тэатры кнігі. Тэатр кнігі ”Пятрушка“ раённай дзіцячай бібліятэкі Сенненскай ЦБС мае званне ”народны“.

Пры арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў для дзяцей і падлеткаў публічныя бібліятэкі Віцебскай вобласці цесна супрацоўнічалі з рознымі арганізацыямі і ўстановамі: школамі, дзіцячымі садамі, цэнтрамі дзіцячай творчасці, школамі мастацтваў, дзіцячымі аздараўленчымі лагерамі, дзіцячымі сацыяльнымі прытулкамі, клубнымі і медыцынскімі ўстановамі, аддзеламі па надзвычайных сітуацыях і праваахоўнымі органамі, царквой, грамадскімі арганізацыямі і г.д.

За справаздачны год дзіцячымі бібліятэкамі было праведзена **3 940** масавых мерапрыемстваў, у тым ліку анлайн – **85**.

У 2022 годзе былі афармлены **1 727** *бібліятэчных экспазіцый* і **153** *мастацкіх выстаў*. Для развіцця творчасці дзяцей і падлеткаў дзіцячымі бібліятэкамі было праведзена **152** *майстар-класы* і арганізавана **164** *акцыі*. Такая работа дазваляе змястоўна арганізаваць вольны час дзяцей, спрыяе фарміраванню культуры міжасабовых зносін, выяўленню і ў пэўнай ступені рэалізацыі творчых здольнасцей і задаткаў дзяцей. Таксама бібліятэкі працягвалі працаваць над стварэннем віртуальных форм работы, такіх як інтэрактыўныя гульні, віртуальныя выставы, анлайн-віктарыны, анлайн-падарожжы, відэапрэзентацыі, сеткавыя акцыі. У цэлым дзейнасць дзіцячых бібліятэк была накіравана на задавальненне чытацкіх патрэб, папулярызацыю нацыянальнай і культурнай спадчыны, мовы і літаратуры, на падтрымку і развіццё чытання сярод дзяцей і падлеткаў.

Падводзячы вынікі працы за 2022 год, можна адзначыць, што ішла імклівая праца па ўсіх напрамках бібліятэчнай справы. Гэта праца прынесла станоўчыя вынікі: у дзейнасці знайшлі адлюстраванне ўсе значныя падзеі і знамянальная даты, бібліятэкі па-ранейшаму працягвалі ўдасканальваць сваю дзейнасць як інфармацыйныя, культурныя і асветніцкія цэнтры для дзяцей і падлеткаў.

## Дзейнасць дзіцячых бібліятэк у Год гістарычнай памяці. Краязнаўчае выхаванне

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 студзеня 2022 года падпісаў Указ нумар 1 ”Аб аб’яўленні 2022 года Годам гістарычнай памяці“ ў мэтах фарміравання аб’ектыўных адносін грамадства да гістарычнага мінулага, захавання і ўмацавання адзінства беларускага народа.

Гэты год дзіцячыя бібліятэкі вобласці распачалі выставачнымі экспазіцыямі *”Будзем жыць і памятаць“* **(дзіцячая бібліятэка Сенненскай ЦБС)**, *”Сильна держава, коль народ един“* **(Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка)**, *”Памяці гартаючы старонкі“* **(Докшыцкая дзіцячая бібліятэка)**, *”Беларусь – мой дом“* **(дзіцячая бібліятэка Лепельскай ЦБС)**, *”Ганаруся, што беларусам завуся“* **(гарадская дзіцячая бібліятэка Талачынскай ЦБС)** і праектамі *”Браслаў: тут мінуўшчына з сучаснасцю сышліся“* **(дзіцячая бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна)**, *”Славен город делами, славен город людьми“* **(дзіцячая бібліятэка імя Н. Крупскай Аршанскай ЦБС)**, *”Абразкі з жыцця нашых продкаў“* **(Бешанковіцкая дзіцячая раённая бібліятэка)**, каб перадаць нашчадкам пачуццё глыбокага патрыятызму, любові да сваёй Радзімы.

**Патрыятычныя і асветніцкія акцыі, творчыя сустрэчы,** літаратурныя падарожжы, **анлайн-чэленджы,** квэст-гульні, завочныя экскурсія **– гэта не поўны пералік мерапрыемстваў, якія былі падрыхтаваны да Года гістарычнай памяці з не менш яскравымі назвамі**: *”Праз мінулае ў сучаснасць“* **(бібліятэка імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска)**, *”Беларусь – краіна замкаў і палацаў“, ”Историческая память – дорога в будущее“* **(дзіцячая бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна)**, *”Беларусь – страна единства“* **(Мёрская дзіцячая бібліятэка)**, *”Мой родны край – мая жывая гісторыя“* **(бібліятэка імя М. Лынькова ЦБС г. Віцебска)** і г.д.

З верасня 2022 года пры **дзіцячай бібліятэцы ЦБС Браслаўскага раёна** пачаў сваю дзейнасць клуб юных аматараў беларускай этнаграфіі *”ЭтнаЎсё пра Беларусь“*. У рамках аматарскага фарміравання прайшлі этнаграфічная гадзіна *”У гумне, адрыне, свірне“*, слайд-экскурсія ў беларускую вясковую хату *”Просім у хату, госцейкі нашы!“*, этнаграфічны калейдаскоп аб традыцыях беларускай сялянскай сям’і *”Хто ў хаце гаспадар?“* і смачная гадзіна *”Беларускія прысмакі, ці Ежа нашых продкаў“*. Таксама трэба адзначыць, што справаздачны год стаў



| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Шаркаўшчынская ЦБС** | | | | | | |
| 26 | Клуб **”Жывое слова“** | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 2017 | 7 | літаратурна-мастацкі | сяр.шк. |
| **Шумілінская ЦБС** | | | | | | |
| 27 | Клуб па інтарэсах **”Homolegens“** | Дзіцячая бібліятэка | 2007 | 12 | прафарыен тацыйны | дзеці |
| **ЦБС г. Віцебска** | | | | | | |
| 28 | Гурток **”Бусляня“** | Бібліятэка-філіял №14 імя У. Караткевіча | 2007 | 10 | краязнаўча-экалагічны | дзеці |
| 29 | Клуб **”Вікторыя“** | Бібліятэка-філіял №11 імя М. Лынькова | 2006 | 12 (5 дзеці) | сямейнае выхаванне | бацькі, дзеці |
| 30 | Клуб **”Сустрэча“** | Бібліятэка-філіял №9 імя С. Маршака | 2008 | 10 | арганізацыя вольнага часу | пажылыя |
| **ЦБС г. Наваполацка** | | | | | | |
| 31 | Клуб **”Пралеска“** | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А.С. Пушкіна | 1996 | 26 | экалагічны | мл.шк. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аршанская ЦБС** | | | | | | |
| 12 | Аматарскае аб’яднанне **”Краязнаўчая майстэрня“** | Дзіцячая бібліятэка імя У.С. Караткевіча – філіял № 1 | 2008 | 12 | краязнаўчы | вучні школ горада |
| 13 | Клуб аматараў бісерапляцення **”З любоўю і фантазіяй“** | | 2011 | 17 | мастацкі | дзеці і дарослыя |
| 14 | Клуб **”Уют-компания“** | Дзіцячая бібліятэка імя Н. Крупскай – філіял № 8 | 2010 | 39 | дасугавы | дзеці і дарослыя |
| **Полацкая РЦБС** | | | | | | |
| 15 | Экалагічны клуб **”Экоша“** | Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 | 2000 | 25 | экалагічны | дзеці |
| 16 | Урокі бяспекі **”Безопасное детство“** | Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 | 2018 | 11 | здаровы лад жыцця, прававое выхаванне | дзеці |
| **Пастаўская ЦБС** | | | | | | |
| 17 | Клуб **”Нашчадкі“** | Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі – філіял № 1 | 2007 | 27 | краязнаўчы | дзеці |
| **Расонская ЦБС** | | | | | | |
| 18 | Клуб **”Кнігачэй-эколаг“** | Расонская дзіцячая бібліятэка | 2007 | 10 | экалагічны | дзеці |
| **Сенненская ЦБС** | | | | | | |
| 19 | Клуб **”Чамучка“** | Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1 | 2017 | 9 | літаратурна-мастацкі | мл.шк. |
| **Талачынская ЦБС** | | | | | | |
| 20 | Гурток **”Мельпамена“** | Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 | 2006 | 10 | літаратурна-мастацкі | дзеці |
| 21 | Гурток **”Майстрыха“** | | 2006 | 10 | вытворча-тэхнічны | дзеці |
| **Чашніцкая РЦБС** | | | | | | |
| 22 | Клуб **”Чамучка“** | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 1993 | 23 | навукова-пазнавальны | дзеці |
| 23 | Аматарскае аб’яднанне **”Крыніца“** | | 1998 | 20 | духоўна-краязнаўчы | дзеці |
| 24 | Клуб па інтарэсах **”Эўрыка“** | Новалукомльская дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 | 2013 | 25 | навукова-пазнавальны | дзеці |
| 25 | Клуб духоўнай асветы **”Благодать“** | | 2020 | 29 | духоўны | дзеці |



завяршаючым годам для краязнаўча-пошукавага праекта *”Браслаў: тут мінуўшчына з сучаснасцю сышліся“*. Вынікам стала пастаянна дзеючая выстава са 175 фотаздымкамі, фотаальбомам з 400 здымкамі з тэкставымі каментарыямі, была падрыхтавана відэапрэзентацыя, распрацаваны сцэнарый слайд-падарожжа па горадзе Браславе ў прасторы і часе *”Гэта наш з табою горад. Гэта наша гісторыя“*. Усе наведвальнікі бібліятэкі маюць магчымасць скапіраваць матэрыялы на электронныя носьбіты, набыць альбом альбо асобныя фотаздымкі пажаданага фармату. Адметнасцю сабраных матэрыялаў з’яўляецца тое, што адны і тыя аб’екты прадстаўлены на фотаздымках у розныя часы.

Паспяхова быў рэалізаваны праект да 575-годдзя першага ўпамінання г.п. Бешанковічы ў пісьмовых крыніцах *”Абразкі з жыцця нашых продкаў“* **дзіцячай раённай бібліятэкай Бешанковіцкай ЦБС**. У рамках праекта прайшоў цыкл мерапрыемстваў па вывучэнню гісторыі роднага краю, культуры, мясцовых традыцый; сустрэчы з майстрамі Бешанковіцкага раённага Дома рамёстваў *”Майстры на ўсе рукі“*; дэгустацыі нацыянальнай стравы *”Смаку не абабрацца“*; экскурсіі па памятных мясцінах гарадского пасёлка *”Память бережно храним“*; выставы беларускага нацыянальнага касцюма *”І дома гожа, і ў гасцях прыгожа“*; майстар-класы *”Вялікодныя пісанкі“*; краязнаўчыя гутаркі *”Старажытныя роды Бешанковіцкага краю“*.

У **раённай дзіцячай бібліятэцы імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС** працавала творчая лабараторыя *”Таямніцы беларускага ўзору“*. Першакласнікі знаёміліся з рознымі сімваламі беларускага арнаменту і на падставе атрыманых ведаў пры дапамозе каляровых папяровых нарыхтовак, рабілі сабе прыгожыя закладкі з беларускімі ўзорамі.

## Папулярызацыя беларускай культуры, мовы і літаратуры. Супрацоўніцтва з ГА ”Саюз пісьменнікаў Беларусі“

**2022 год адзначаны вялікай падзеяй у культырным жыцці Беларусі – 140-годдзем з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Кожная дзіцячая бібліятэка падрыхтавала шэраг разнастайных мерапрыемстваў, прысвечаных жыццю і творчасці народных паэтаў. У якасці прыклада можна прывесці** анлайн-марафон *”Дзеці чытаюць Купалу і Коласа“* **(дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна** ЦБС г. Наваполацка**)**, батл твораў *”Купала і Колас – народа душа і голас“* **(дзіцячая бібліятэка Лепельскай ЦБС)**, літаратурнае падарожжа *”З Коласам і Купалам назаўжды“* **(Мёрская дзіцячая бібліятэка)**, музычная імпрэза *”Душа народа ў песнях тых жыве“* і конкурс на лепшага чытальніка вершаў Я. Купалы і Я. Коласа *”Як вясёлкі яскравай дуга ў паэзіі шлях ваш адзначан“* **(бібліятэка імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска)**, літаратурная акцыя *”Ляціць, гучыць Купалы голас!“* **(дзіцячая бібліятэка імя Н. Крупскай Аршанскай ЦБС)**.

Яскрава адзначаўся 110-гадовы юбілей Максіма Танка. **Дзіцячая бібліятэка Сенненскай ЦБС** запрасіла навучэнцаў на літаратурна-музычную імпрэзу *”Я сэрцам пісаў сваю кожную песню“*. У **бібліятэцы-філіяле № 14 імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска** прайшлі паэтычныя хвілінкі *”Плыць за казачны небасхіл“*. Станоўчы эфект атрымала гадзіна паэта-юбіляра *”Ёсць такая зямля“* **дзіцячай бібліятэкі імя Н. Крупскай Аршанскай ЦБС**. Літаратурнае знаёмства *”Выдатны паэт славянскага свету“* **дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы Полацкай РЦБС** дапоўнела лялечным спектаклем *”Журавель і чапля“*.

Прыярытэтным накірункам работы **дзіцячыя бібліятэкі ЦБС г. Наваполацка** ў справаздачным годзе выбралі праектную дзейнасць. Так, дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака **запусціла праект** па папулярызацыі беларускай літаратуры сярод дашкольнікаў *”Расцём разам з беларускай кнігай“*, у рамках якога былі праведзены мерапрыемствы *”Дык жыві і кветней маё роднае слова!“, ”Да нас у госці прыйшоў каток – залаты лабок“, ”Гуканне вясны“, ”Чароўны свет бібліятэкі“* з удзелам выхаванцаў сярэдніх і старэйшых груп дзіцячага сада № 19 г. Наваполацка. **Трэба ўзгадаць, што дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна** прадоўжыла работу па літаратурным медыяпраекце *”Беларуская чытанка“*, які знаёміць маленькіх чытачоў з творамі беларускай літаратуры ў анімацыйным фармаце.

Павысіць цікавасць дзяцей да літаратурнай спадчыны беларускага народа, да чытання дапамагалі шматлікія выставы-прагляды навінак літаратуры на беларускай мове: *”Чытаем без перапынку“* **(дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна** ЦБС г. Наваполацка**)**, *”Чароўны свет беларускай мовы“* **(дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака** ЦБС г. Наваполацка**)**, *”Адкрый для сябе беларускую кнігу“* **(Мёрская дзіцячая бібліятэка)**, *”Мае першыя кніжкі на роднай мове“* **(гарадская дзіцячая бібліятэка Талачынскай ЦБС)**, *”Вітаем кніжку беларускую“* **(дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога Полацкай РЦБС)**.

Дзіцячыя бібліятэкі, па традыцыі, у перыяд веснавых школьных канікул, запрашалі дзяцей на *Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі*. Для бібліятэкараў – гэта час папулярызацыі чытання і бібліятэкі сярод дзяцей і падлеткаў. На працягу сямі дзён бібліятэкары прапаноўвалі сваім чытачам яркія кніжныя экспазіцыі, літаратурныя віктарыны, гульні, творчыя конкурсы, майстар-класы, прэзентацыі кніг. Кожная бібліятэка распрацавала сваю асабістую праграму ў рамках Тыдня: *”Волшебное путешествие в мир книги“* **(дзіцячая бібліятэка Верхнядзвінскай ЦБС)**, *”Вясёлыя кніжныя прыгоды“* **(раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС)**, *”Нам кніга свята падарыла“* **(дзіцячая бібліятэка Чашніцкай РЦБС)**, *”Вясёлка – добрая сяброўка“* **(дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога Полацкай РЦБС)** і г.д.

**Трэба звярнуць увагу на тое, што для дзіцячых бібліятэк Віцебскае абласное аддзяленне ГА ”Саюз пісьменнікаў Беларусі“ стала надзейным партнёрам. На працягу года праводзіліся сумесныя творчыя сустрэчы з пісьменнікамі Сяргеем і Галінай Трафімавымі,**



*Дадатак 6*

## Клубы, гурткі і аматарскія аб’яднанні

| № | Назва клуба | Бібліятэка | Год стварэння | Колькасць удзельнікаў | Напрамак дзейнасці | Мэтавая аўдыторыя |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Бешанковіцкая ЦБС** | | | | | | |
| 1 | Клуб **”Крынічка“** | Філіял ”Дзіцячая раённая бібліятэка“ | 1990 | 17 | літаратурны | дзеці сяр. і ст. шк. узросту |
| **Браслаўская ЦБС** | | | | | | |
| 2 | Клуб **”Всезнайки“** | Дзіцячая бібліятэка | 2020 | 27 | дасугавы | дзеці |
| **Верхнядзвінская ЦБС** | | | | | | |
| 3 | Гурток **”Экоша“** | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 2009 | 22 | экалагічны | дзеці мал. шк. узросту |
| **Глыбоцкая ЦБС** | | | | | | |
| 4 | Клуб **”Кнігавічок“** | Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 2014 | 25 | дасугавы | дзеці мал. і сярэд. шк. узросту |
| 5 | Клуб **”Калейдаскоп“** | | 2019 | 27 | дасугавы | дзеці мал. і сярэд. шк. узросту |
| 6 | Клуб **”Чароўная школа“** | Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 | 1997 | 20 | літаратурна-мастацкі | дзеці мал. і сярэд. шк. узросту |
| **Докшыцкая ЦБС** | | | | | | |
| 7 | Клуб **”Лукамор’е“** | Докшыцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 2007 | 15 | літаратурны | дзеці |
| 8 | Клуб **”Бібліягоша“** | | 2012 | 14 | | |
| **Лепельская ЦБС** | | | | | | |
| 9 | Клуб **”Крынічка“** | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 1999 | 24 | экалагічны | дзеці мал. шк. узросту |
| 10 | Клуб **”Агеньчык“** | | 2022 | 25 | здаровы лад жыцця | дзеці мал. і сяр. шк. узросту |
| **Мёрская ЦБС** | | | | | | |
| 11 | Клуб **”Знайка“** | Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка | 1997 | 15 | дасугавы | мл.шк. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Шумілінская ЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка | http://www.shumilino1.lepshy.by/detskaya-biblioteka | Старонка ”Шумилинская детская библиотека“: https://vk.com/public114768109 | | Старонка ў Instagram: https://www.instagram.com/detskaia_biblioteka_shumilino/ |
| **ЦБС г.Віцебска** | | | | |
| Бібліятэка-філіял № 9 імя С.Маршака | | Старонка ”Самуил Маршак“: https://vk.com/id454998101 | Старонка ”Библиотека Самуил Маршак“: https://ok.ru/profile/561334781176 | |
| Бібліятэка-філіял № 11 імя М.Лынькова | | Старонка ”Библиотека им.М. Лынькова г.Витебск“: https://vk.com/public195501493 | | |
| Бібліятэка-філіял № 12 імя Н.Астроўскага | | Старонка ”Детская-Библиотека Н-Островского“: https://vk.com/id480381092 | | |
| Бібліятэка-філіял № 14 імя У.Караткевіча | | Старонка ”Бібліятэка імя Ул. Караткевіча“: https://vk.com/club166435700 | | |
| **ЦБС г.Наваполацка** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка-філіял №3 імя С.Маршака | http://novopolotsk-lib.by/index.php/detyam | Група ”Детская библиотека имени С.Маршака г.Новополоцк“ https://vk.com/marshaka_np | | Старонка ў Instagram: detskajabiblioteka_np https://www.instagram.com/detskajabiblioteka_np |
| Дзіцячая бібліятэка-філіял №4 імя А.С.Пушкіна | | Група ”Детская библиотека им.А.С.Пушкина“: https://vk.com/pushkin_a_s_lib | | Старонка ў Instagram: ”detskaiabiblioteka_a.s.p“ (Детская Библиотека им. Пушкина): https://www.instagram.com/detskaiabiblioteka_a.s.p/ |



**Ірынай Багданавай, Тамарай Красновай-Гусачэнка і іншымі.** Формы работы былі самымі разнастайнымі: **гадзіны інфармацыі, літаратурна-музычныя гасцёўні, вечары паэзіі, літаратурныя чытанні да юбілейных дат пісьменнікаў. Так, у рамках рэспубліканскай акцыі ”Орша – культурная сталіца 2022“ у** дзіцячай бібліятэцы імя Н. Крупскай Аршанскай ЦБС **прайшла творчая сустрэча з пісьменнікамі-землякамі Галінай і Сяргеем Трафімавымі. У** дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога Полацкай РЦБС **адбылася творчая сустрэча *”Для дзяцей і не толькі“* з Ірынай Багданавай. Прэзентацыя кнігі Тамары Красновай-Гусачэнка *”Край родной, любимый“* прайшла ў** бібліятэках імя У. Караткевіча, імя Я. Маўра, імя С. Маршака, імя П. Броўкі ЦБС г. Віцебска**.** Году гістарычнай памяці была прысвечана прэзентацыя дзіцячай кнігі Андрэя Герашчанкі ”Бельчонок“, якая адбылася ў **дзіцячай бібліятэцы імя С. Маршака** ЦБС г. Наваполацка**.**

## Патрыятычнае выхаванне

Фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму, любові да Радзімы – адзін з напрамкаў дзейнасці дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці. У сваёй рабоце бібліятэкары выкарыстоўваюць розныя формы.

У 2022 годзе пад агульнай рэдакцыяй Генеральнага пракурора, доктара юрыдычных навук Андрэя Шведа, ”Выдавецтва ”Беларусь“ выпусціла ўнікальны зборнік ”Геноцид белорусского народа“. З гэтай нагоды ўсе дзіцячыя бібліятэкі Віцебскай вобласці правялі прэзентацыю выдання з удзелам прадстаўнікоў органаў пракуратуры, службовых асоб і грамадскіх аб’яднанняў. Дзеці і падлеткі даведаліся аб новых жахлівых фактах ваеннага і пасляваеннага часу. Асноўная задача была накіравана на захаванне гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне.

**Бібліятэка імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска** сумесна з Першамайскай раённай арганізацыяй г. Віцебска ”Беларускае грамадскае аб’яднанне ветэранаў“ (БГАВ) з мэтай патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення, перадачы ад ветэранаў нашчадкам праўдзівай інфармацыі пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, вайны ў Афганістане, свайго пражытага вопыту і назапашаных папярэднімі пакаленнямі каштоўнасцей у 2022 годзе пачала рэалізоўваць праект *”Радзіма мая дарагая, красуйся і ў шчасці жыві!“* У рамках рэалізацыі праекта праводзіліся мерапрыемствы з удзелам вязняў канцэнтрацыйных і працоўных лагераў, воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў працы.

У рамках паэтычнага open-air *”Стихи над городом“ ”Победа. Одна на всех“* **Полацкай РЦБС** працавала дзіцячая інтэрактыўная пляцоўка *”День Победы помнят деды, знает каждый из внучат“*. Самыя маленькія яе наведвальнікі складалі пазлы з выявай ваеннай тэхнікі, адгадвалі загадкі, а таксама з задавальненнем размалёўвалі арт-плакат *”Расцвела салютами Победа“*. Падлеткі і дарослыя адказвалі на пытанні віктарыны ”*Горькая память войны: цифры и факты*“, удзельнічалі ў

філвордзе *”Вписаны особою строкою в историю герои-города“*, разгадвалі ваенныя шыфраграмы *”Строки, опаленные войной“*. Асабліва спадабалася наведвальнікам пляцоўка QR-гульні *”Песни, пришедшие с войны“* і майстар-класы *”Открытка для ветерана“*, *”Победный май“*.

Выхоўваць патрыятычныя пачуцці дапамагалі таксама інфармацыйна-патрыятычныя гадзіны, гадзіны мужнасці, літаратурна-музычныя вечарыны, квэсты *”Няхай будзе светлай наша памяць “* **(дзіцячая бібліятэка Чашніцкай РЦБС)**, *”Цяжкія крокі да Вялікай Перамогі“* **(гарадская дзіцячая бібліятэка Талачынскай ЦБС)**, *”Военная мозаика“* **(дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога Полацкай РЦБС)**, *”Памятай! Памятай! Памятай!“* **(бібліятэка імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска)**.

Гульнявая форма асабліва любімая і дашкольнікамі і больш старэйшымі дзецьмі. Гэта бібліятэкары ведаюць і арганізуюць мерапрыемствы з выкарыстаннем гульні. Асабліва гэта адчувалася пад час святкавання Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Бібліятэкі прапанавалі сваім чытачам квэст *”Святое дело Родине служить!“* **(дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка)**, конкурсна-гульнявую праграму *”Тяжело в ученье – легко в бою“* **(Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка)**, конкурс *”Подрастём, ребята, и пойдем в солдаты“* **(дзіцячая бібліятэка Лепельскай ЦБС)**.

Асветніцкая дзейнасць бібліятэкі не была б поўнай без кніжна-ілюстрацыйных выстаў і стэндаў з фатаграфіямі і ўзнагароднымі дакументамі суайчыннікаў – удзельнікаў вайны: *”Холокост. Память поколений“* **(дзіцячая бібліятэка Сенненскай ЦБС)**, *”І ўспомніць страшна і забыць нельга!“* **(дзіцячая бібліятэка Шумілінскай ЦБС)**, *”Беларусь памятае“* **(дзіцячая бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна)**, *”Для тех, кто счастье завоевал“* **(Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка)**, *”Спасибо, что конца урокам нет!“* **(дзіцячая бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна)**, *”Память на все времена“* **(Мёрская дзіцячая бібліятэка)**, *”Полымя вайны“* **(дзіцячая бібліятэка Шаркаўшчынскай ЦБС)**, *”Маленькія героі вялікай вайны“* **(дзіцячая бібліятэка Чашніцкая РЦБС)**.

Вялікай папулярнасцю сярод чытачоў карысталіся мерапрыемствы, падрыхтаваныя з прымяненнем электронных сродкаў інфармацыі, такіх як мультымедыйныя прэзентацыі, віртуальныя падарожжы: *”Памяць“* **(дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка)**, *”Дзеці вайны“* **(дзіцячая бібліятэка Шумілінскай ЦБС)**, *”Детям, пережившим ту войну“* **(Докшыцкая дзіцячая бібліятэка)**.

Вялікая Айчынная, для многіх сённяшніх хлопчыкаў і дзяўчынак пайшла ў далёкае мінулае, але памятаць людзей, якія адстаялі сваю Радзіму ў тыя гады, абавязкова трэба. Гэтаму садзейнічалі акцыі: *”Бессмертный полк литературных героев“* **(Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка)**, *”Дрэва Памяці“* **(гарадская дзіцячая бібліятэка Талачынскай ЦБС)**, *”Далёкому мужеству верность храня: читаем книги о Великой Отечественной войне“* **(дзіцячыя бібліятэкі ЦБС г. Віцебска)** і г.д.



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Аршанская ЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча – філіял № 1 | | Група ”Детская библиотека им. В.С. Короткевича“: https://vk.com/club187365088 Старонка ”Детская-Библиотека Им-Вс-Короткевича“ https://vk.com/childlibrary1 | | Профіль ў Instagram ”Детская библиотека им. В.С.Короткевича“: https://instagram.com/biblioteka_korotkevicha?utm_med |
| Дзіцячая бібліятэка імя Н.К. Крупскай – філіял № 8 | | Старонка ”Детская-Библиотека Им-Нк-Крупской“ https://vk.com/id699535915 | | |
| **Полацкая РЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка імя Л.Талстога – філіял №1 | | Група ”Детская библиотека им. Л.Н.Толстого (филиал №1)“: https://vk.com/club44671036 Старонка ”Библио Филиал“ Центр чтения и активного творчества в Полоцке: https://vk.com/bibliopuzzle | | Старонка ў Instagram: https://www.instagram.com/detbibl.tolstoy.polock |
| Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 | | | Група ”Бібліятэка імя Я. Журбы“: https://ok.ru/group/55269949243423 | |
| **Пастаўская ЦБС** | | | | |
| Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі – філіял № 1 | http://libpost.of.by/chitatelyu/detskaya-stranichka/ | ”Поставская Детская-Библиотека“: https://vk.com/id764027439 | | Старонка ў Instagram: www.instagram/child_library_postavy/ |
| **Сенненская ЦБС** | | | | |
| Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1 | http://cbs-senno.by/index.php/pages/all-for-kids | | | |
| **Чашніцкая ЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка-філіял №1 | | | | Старонка ў Instagram: https://www.instagram.com/detbibchashniki/ |

*Дадатак 5*

## Прадстаўніцтвы дзіцячых бібліятэк у сацыяльных сетках

| Назва бібліятэкі | Дзіцячая старонка на сайце ЦБС | ВКонтакте | Одноклассники | Instagram Facebook |
|---|---|---|---|---|
| **Бешанковіцкая ЦБС** | | | | |
| Філіял ”Дзіцячая раённая бібліятэка“ | http://beshenkovichicbs.by/ru/filial-detskaya-rayonnaya-biblioteka | Старонка ”Бешенковичская-Детская Районная-Библиотека“: https://vk.com/rdb2000 | | |
| **Верхнядзвінская ЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | https://xn—90aabzbrw.xn—90ais/stranichka-odnoj-biblioteki | | Група ”Верхнедвинская детская библиотека“: https://ok.ru/vdvinskchild | Група ”child_library.vdvinsk“: https://www.instagram.com/child_library.vdvinsk/ |
| **Глыбоцкая ЦБС** | | | | |
| Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 | http://cbs.okglub.by/dlya-dashkolnikau-i-vuchnyau | Група ”Подсвильская-Детская-Библиотека библиотека“: https://vk.com/id619518729 | | |
| **Докшыцкая ЦБС** | | | | |
| Докшыцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | Сайт: http://det.doklibrary.by/index.php/ru | Група ”Докшицкая-Детская Библиотека“: https://vk.com/id552762520 | | |
| **Лепельская ЦБС** | | | | |
| Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | | Старонка ”детская библиотека г. Лепель“: https://vk.com/public55828453 | Група ”Детская библиотека ГУК «Лепельская ЦБС»“: https://ok.ru/group/60726043607226 | Старонка ў Instagram ”biblioteka_detskaya_lepel“: https://www.instagram.com/biblioteka_detskaya_lepel/ |
| **Мёрская ЦБС** | | | | |
| Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка | https://miory-biblioteka.by/detskay | Група ”Миорская-Детская Библиотека“: https://vk.com/id435146937 | | |



## Эстэтычнае выхаванне

Комплексныя праграмы абслугоўвання маладзёжнай аўдыторыі, буйныя акцыі і культурныя праекты адыгрываюць значную ролю ў фарміраванні пазітыўнага ладу любой бібліятэкі. Разумеючы гэта, многія бібліятэкі рэгіёна выкарыстоўваюць у сваёй дзейнасці па эстэтычным выхаванні праграмы і праекты разнастайнай тэматыкі.

**Бібліятэка імя М. Лынькова ЦБС г. Віцебска** ў 2022 годзе распрацавала праект творчага развіцця *”Аленький цветочек“* з мэтай папулярызацыі кнігі і чытання праз творчую дзейнасць дзяцей малодшага школьнага ўзросту. У рамках рэалізацыі праекта ўдзельнікі на сустрэчах даведаліся, чым малюе мастак, аб чароўным свеце фарбаў, пазнаёміліся з тэхнікай работы акварэллю і гуашшу, прынялі ўдзел у паэтычнай мазаіцы і літаратурным конкурсе *”В мире сказок“*, даведаліся аб знакамітых мастаках-ілюстратарах, а мастацкія работы ўдзельнікаў праекта дэманстраваліся на бібліятэчнай выставе *”Новогодние фантазии“*.

Папулярызацыі творчасці А.С. Пушкіна сярод дзяцей спрыяла мэтавая праграма **дзіцячай бібліятэкі імя А. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка** *”Пушкин – XXI век – Новополоцк“*. У яе рамках прайшлі арт-гадзіна *”Надзя Рушава і Пушкін“*, урок-расследаванне *”Тайна последней дуэли“*, гадзіна цікавага паведамлення *”Мультипликационная пушкиниана“*, выстава дзіцячага малюнка *”Галерэя пушкінскіх герояў“*, літаратурны квэст *”З днём нараджэння, Аляксандр Сяргеявіч!“*

На пачатку справаздачнага года ў **раённай дзіцячай бібліятэцы імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС** быў распрацаваны праект *”Радасць“*, каб пераключыць увагу людзей з негатыву на пазітыў. Распачаўся праект паэтычным вернісажам *”Модныя трэнды“*. Супрацоўнікі бібліятэкі прапанавалі мясцовым паэтам напісаць невялікія вершы, прысвечаныя радасці, якія пазней размяшчаліся ў сацыяльнай сетцы Instagram. У сакавіку на абанеменце для ўсіх наведвальнікаў быў падрыхтаваны квілт *”Усміхніся сусвету і сусвет усміхнецца табе“*. Трэба сказаць, што у рамках праекта расчыніў свае дзверы літаратурны салон *”Радасная кніга“*. Станоўчы водгук атрымала арт-прастора *”Магія радасці“*, на якой былі размешчаны фотаработы вядомых пастаўскіх фотамастакоў. Кніжная экспазіцыя вясёлых кніг і рытмічная музыка дапоўнілі фотавыставу, стварылі сапраўдную прастору радасці і пазітыўнага настрою ўсім, хто апынуўся ў гэты час каля бібліятэкі. Акрамя таго, актыўныя чытачы, якія ўдзельнічалі ў праекце, раздавалі ўсім жадаючым невялікія буклецікі *”Радасная кніжыца“*. Выніковым мерапрыемствам праекта стаў круглы стол з псіхолагам *”Тэрапія радасці“*.

У рамках праекта *”BiblioPUZZLE“* **дзіцячай бібліятэкай імя Л. Талстога Полацкай РЦБС** была створана студыя гульнявога чытання *”Смышлёныш“*, якая ставіць сваёй мэтай навучыць выразнаму і асэнсаванаму чытанню дзяцей, уключае ў сябе тэатралізаваныя інсцэніроўкі, гульні на развіццё маўлення і ўзбагачэнне слоўнікавага

запасу. Так, на працягу года, дзеці сталі ўдзельнікамі пазнавальнага квэсту *”Тайна старинной книги“*, пазнаёміліся з казкай *”У страха глаза велики“*, вершамі С. Маршака на занятках *”Дом, который построил Маршак“*, даведаліся, як лясныя звяры да зімы рыхтуюцца на занятку *”Лесная газета. Месяц полных кладовых“*, дзякуючы *”Лесной газете“* В. Біянкі, наведалі творчыя заняткі *”Как мышонок Шустрик к холодам готовился“* і *”Здравствуй, гостья Зима!“*.

Народны лялечны тэатр кнігі *”Пятрушка“* **Сенненскай дзіцячай раённай бібліятэкі** – эфектыўны сродак папулярызацыі кнігі, абуджэння і развіцця творчай актыўнасці дзяцей і падлеткаў, які на працягу года сваімі цікавымі сюжэтамі, прыгожай музыкай, вясёлымі песнямі дарыў гледачам добры настрой і пазітыўную энергію. У 2022 годзе тэатрам было паказана 24 прадстаўленні, з іх 8 дабрачынных. Асабліва плённа тэатр працаваў у час летніх канікул, калі ў дзіцячую бібліятэку завіталі гледачы з сенненскіх школ і садоў, Цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, а таксама сельскіх школ. Найбольш цікавымі для дзяцей сталі спектаклі: *”Волшебный колпачок“*, *”Чистюля Колобок“*, *”Природа – это мы“*, *”Как лиса медведя обманывала, да потом сама попалась“*, *”Чудесная страна библиотека“*, *”А пачнём мы казку так…“*

Актуальным і запатрабаваным з’яўляецца гурток *”Мельпамена“* **гарадской дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 49 Талачынскай ЦБС**. Драматычны гурток актыўна прымае ўдзел у правядзенні раённых святаў і масавых мерапрыемстваў у бібліятэцы. Так, за мінулы год удзельнікі гуртка падрыхтавалі і паказалі тэатралізаваныя святы *”Каралева кнігі“*, *”Ах ты зімачка, зіма“*, ранішнік *”Ёсць у сакавіку асаблівы дзень“*, сітуацыйную гульню *”Азбука дарогі“*, тэатральныя пастаноўкі *”Як мы любім нашых мам“*, *”Цудоўнае бюро феі АБЖ“*.

Спрыяць эстэтычнаму выхаванню на працягу года таксама дапамагалі арт-выставы: *”Мастак – воін, мастак – грамадзянін“* **(дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка)**, *”Закружилась листва золотая“* **(бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Віцебска)**, *”Волшебство ручной работы“* **(дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС)** і г.д.

## Здаровы лад жыцця

На працягу ўжо некалькіх апошніх гадоў прыкметна ўзрасла запатрабаванасць бібліятэк як цэнтраў здаровага ладу жыцця. Здароўе неабходна любому чалавеку. Асабліва важна захаваць здароўе дзяцей і падлеткаў.

У 2022 годзе **дзіцячая бібліятэка Лепельскай ЦБС** працавала па праекце *”МЧС спешит в библиотеку“* сумесна з Лепельскім раённым аддзелам па надзвычайных сітуацыях (РАНС). Вынікам працы сталі 16 мерапрыемстваў, у якіх прымалі ўдзел дзеці школьных лагераў дзённага знаходжання і чытачы бібліятэкі 3-5-х класаў. У конкурсна-пазнавальнай



*Дадатак 4*

## Сацыякультурная дзейнасць

| № | ЦБС | Арганізавана і праведзена | | | | | | Рэалізавана | | Клубы | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | мерапрыемстваў | | акцый | майстар-класаў | выстаў | | праграм | праектаў | адзінак | удзельнікаў |
| | | усяго | анлайн | | | бібл. | маст. | | | | |
| 1 | Бешанковіцкая | 71 | 11 | 4 | 0 | 24 | 1 | 2 | 2 | 1 | 17 |
| 2 | Браслаўская | 201 | 0 | 6 | 0 | 82 | 5 | 0 | 2 | 1 | 27 |
| 3 | Верхнядзвінская | 59 | 3 | 8 | 7 | 29 | 2 | 1 | 0 | 1 | 22 |
| 4 | Глыбоцкая | 144 | 0 | 8 | 1 | 65 | 1 | 3 | 0 | 3 | 72 |
| 5 | Докшыцкая | 114 | 9 | 3 | 8 | 58 | 0 | 2 | 5 | 2 | 29 |
| 6 | Лепельская | 117 | 0 | 3 | 1 | 63 | 11 | 3 | 1 | 2 | 49 |
| 7 | Мёрская | 76 | 1 | 4 | 6 | 84 | 16 | 2 | 0 | 1 | 15 |
| 8 | Аршанская | 225 | 0 | 22 | 5 | 227 | 28 | 2 | 5 | 3 | 68 |
| 9 | Полацкая | 436 | 0 | 4 | 33 | 80 | 5 | 8 | 2 | 2 | 36 |
| 10 | Пастаўская | 107 | 0 | 7 | 3 | 28 | 2 | 0 | 2 | 1 | 27 |
| 11 | Расонская | 35 | 0 | 1 | 2 | 58 | 1 | 0 | 0 | 1 | 10 |
| 12 | Сенненская | 122 | 0 | 4 | 0 | 30 | 8 | 0 | 1 | 1 | 9 |
| 13 | Талачынская | 75 | 0 | 8 | 2 | 58 | 3 | 1 | 0 | 2 | 20 |
| 14 | Чашніцкая | 360 | 0 | 10 | 3 | 271 | 14 | 2 | 1 | 4 | 97 |
| 15 | Шаркаўшчынская | 43 | 3 | 2 | 4 | 18 | 5 | 0 | 2 | 1 | 7 |
| 16 | Шумілінская | 190 | 0 | 48 | 23 | 17 | 0 | 0 | 0 | 1 | 12 |
| | **Усяго па РЦБС** | 2375 | 27 | 142 | 98 | 1192 | 102 | 26 | 23 | 27 | 517 |
| 17 | г. Віцебск | 1101 | 56 | 18 | 54 | 416 | 44 | 3 | 5 | 3 | 32 |
| 18 | г. Наваполацк | 464 | 2 | 4 | 0 | 119 | 7 | 8 | 8 | 1 | 26 |
| | **Усяго па ГЦБС** | 1565 | 58 | 22 | 54 | 535 | 51 | 11 | 13 | 4 | 58 |
| | **УСЯГО** | **3940** | **85** | **164** | **152** | **1727** | **153** | **37** | **36** | **31** | **575** |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЦБС г.Віцебска** | | | | | |
| Зуева Святлана Вячаславаўна | Бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака | пн. – чц. 10.00–19.00 сб., нд. 10.00–18.00 | пятніца | 1-ы панядзелак месяца | 210009 г. Віцебск, пр-т Фрунзэ, 60 Тэлефон: 8-0212-26-25-10 E-mail: childlib@cbsvit.by |
| Чарнушына Таццяна Аляксандраўна | Бібліятэка-філіял № 10 імя Я. Коласа | аўт. – пт. 10.00–19.00 сб., нд. 10.00–18.00 | панядзелак | 1-ы чацвер месяца | 210008 г. Віцебск, вул. М.Горкага,120 Тэлефон: 8-0212-36-26-44 E-mail: libr_kolasa@cbsvit.by |
| Чарнова Наталля Юр'еўна | Бібліятэка-філіял № 11 імя М. Лынькова | аўт. – пт. 10.00–19.00 сб., нд. 10.00–18.00 | панядзелак | 1-ы чацвер месяца | 210007 г. Віцебск, вул. Зеленагурская,14 Тэлефон: 8-0212-26-31-35 E-mail: libr_linkova@cbsvit.by |
| Есіпенка Іна Валяр'янаўна | Бібліятэка-філіял № 12 імя М. Астроўскага | 11.00–19.00 | пятніца | 1-ы панядзелак месяца | 210024 г. Віцебск, вул. Дзімітрава,34 Тэлефон: 8-0212-64-90-26 E-mail: library12@cbsvit.by |
| Ражноўская Галіна Іванаўна | Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча | аўт. – пт. 09.00–19.00 сб., нд. 10.00–18.00 | панядзелак | 1-ы аўторак месяца | 210029 г. Віцебск, пр-т Маскоўскі,64 Тэлефон: 8-0212-37-02-77 E-mail: bibliokor@cbsvit.by |
| **ЦБС г.Наваполацка** | | | | | |
| Хватынец Таццяна Вячаславаўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака | пн. – пт. 10.00–19.00 нд. 11.00–19.00 | субота | апошні дзень месяца | 211447 г. Наваполацк, вул. Маладзёжная,106 Тэлефон: 8-0214-50-39-92 E-mail: filial3.novopolotsk@yandex.by |
| Варанец Таццяна Валер'еўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А. Пушкіна | пн. – пт. 10.00–19.00 сб. 11.00– 9.00 | нядзеля | апошняя серада месяца | 211446 г. Наваполацк, вул. Юбілейная,1 Тэлефон: 8-0214-57-24-84 E-mail: lib4pushkin@yandex.by |



праграме *"Лето классное, безопасное"* дзеці адправіліся ў паход па краіне Бяспекі. Каб не атрымаць сонечны ўдар дзеці разам з бібліятэкарамі зрабілі пілоткі з газет, даведаліся правілы паводзін на вадаёмах і прайшлі эстафету *"Доплыви до берега"*, пагулялі ў гульні *"Собери мусор"*, *"Съедобное и несъедобное"*, паўдзельнічалі ў гульнявой праграме *"Каникулы без дыма и огня"*, які суправаджаўся гульнявым дыялогам з дыспетчарам службы выратавання.

У **дзіцячай бібліятэцы імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС** Дзень пажарнай службы Беларусі стаў падставай для размовы аб бяспецы і правілах паводзін у надзвычайных сітуацыях. Супрацоўнікі бібліятэкі правялі акцыю *"Твая бяспека ў тваіх руках"*, інфарм-хвілінкі *"Моё безопасное детство"*. Кожнаму ўдзельніку ў падарунак уручалі памятку *"Твоя безопастность в твоих руках"*, на адваротным баку якой пералічаліся ўсе тэлефоны экстраных служб.

Здароваму ладу жыцця былі прысвечаны інтэлектуальна-забаўляльная праграма *"Вокруг спорта, и не только"* **(дзіцячая бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна)**, бібліяўрок *"Путешествие в страну Безопасность"* **(Мёрская дзіцячая бібліятэка)**, конкурсна-гульнявая праграма *"Мы за здаровы лад жыцця!"* **(дзіцячая бібліятэка Чашніцкай РЦБС)**, тэатралізаваны ранішнік *"Я здоровье берегу, сам себе я помогу"* **(бібліятэка імя М. Астроўскага ЦБС г. Віцебска)**, гульнявы турнір *"Расти здоровым"* **(раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС)**.

На працягу года для дзяцей таксам праводзіліся акцыі: *"Хочаш быць здаровым – будзь!"* **(дзіцячая бібліятэка Шумілінскай ЦБС)**, *"Здоровым будешь – всё добудешь"* **(дзіцячая бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна)**, *"За бяспеку разам"* **(дзіцячая бібліятэка Чашніцкай РЦБС)**, *"Будьте здоровы"* **(Сенненская дзіцячая бібліятэка)**.

Кніжныя выставы знаёмілі дзяцей з карыснымі парадамі, рэкамендацыямі і навуковымі адкрыццямі па тэме здаровага ладу жыцця і дапамагалі выкарыстоўваць атрыманыя веды на карысць свайго здароўя: *"Курыць не модна – дыхай свабодна"* **(гарадская дзіцячая бібліятэка Талачынскай ЦБС)**, *"Рюмка – не для подростка"* **(раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі Пастаўскай ЦБС)**, *"Мы за жизнь без табачного дыма"* **(дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога Полацкай РЦБС)**, *"Алкоголь – похититель рассудка"* **(Мёрская дзіцячая бібліятэка)**, *"Здаровы Я – здаровая нацыя"* **(Докшыцкая дзіцячая бібліятэка)**.

## Выхаванне экалагічнай культуры

Дзіцячыя бібліятэкі займаюцца распаўсюджваннем інфармацыі аб стане навакольнага асяроддзя, экалагічнай бяспецы і выкарыстання прыродных рэсурсаў. Адмысловую папулярнасць сярод дзяцей маюць акцыі практычнай дзейнасці: уборка тэрыторыі, пасадка дрэў, выраб кармушак для птушак, ачыстка берагоў ракі.

Штогод бібліятэкары папаўняюць свой багаж разнастайнымі мерапрыемствамі экалагічнай тэматыкі, у якія ўключаюць элементы гульні, інтэрактыву і тэатралізацыі. Так, **дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка** прапанавала імпрэзу *”Бібліятэчнае экаагенства“*, дзе дзеці ператвараліся ў эка-агентаў і праводзілі экалагічныя расследаванні, гулялі ў гульні *”Играем-сортирум“* і *”Экалагічны святлафор“*. У рамках праграмы *”Через книгу в мир природы“* **Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка** правяла экалагічны ўрок *”Невелика птичка синичка, а свой день знает“*, гадзіну цікавай інфармацыі *”И хоть они огромные, но в море очень скромные“*, прэс-тур па часопісах *”Зоологический вернисаж“*. Чытачоў **дзіцячай бібліятэкі Лепельскай ЦБС** захапіў экатурнір *”Волшебный мир зверей и птиц“*, дзе хлопчыкі і дзяўчынкі праверылі сваю кемлівасць у гульні *”Звярыныя сцежкі“*. Навошта трэба эканоміць энергію, і як гэта правільна рабіць, растлумачылі ў **дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога Полацкай РЦБС** падчас пазнавальнай гульні *”Энергии Земли – надежную защиту!“*

У 2022 годзе дзіцячымі бібліятэкамі Віцебскай вобласці распрацоўваліся і выдаваліся рэкамендацыйныя спісы літаратуры, напамінкі, закладкі, лістоўкі, каляндары, буклеты прысвечаныя экалагічнай тэматыцы: *”Лазаревка – птица года 2022 года в Беларуси“*, *”Новые издания по экологии“* **(дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка)**; *”Братья наши меньшие: их права и защита“*, *”Птица года Беларуси“*, *”Эко-дом и мы в нём“*, *”Эколог – профессия будущего“* **(Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка)**; *”Энергазберажэнне ў сям’і“*, *”Правілы паводзін у прыродзе, або экалагічны этыкет“* **(дзіцячая бібліятэка Чашніцкай РЦБС)**, *”Береги энергию“* **(дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога Полацкай РЦБС)** і г.д.

На працягу года дзейнічалі кніжныя выставы: *”Экологический вестник“* **(Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка)**, *”Удивительное путешествие по живой земле“* **(дзіцячая бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна)**, *”Мы з кнігай адкрываем свет прыроды“* **(дзіцячая бібліятэка Чашніцкай РЦБС)**, *”За прыроду ўсе ў адказе і дарослыя, і дзеці!“* **(гарадская дзіцячая бібліятэка Талачынскай ЦБС)**.

## Духоўнае выхаванне

У **Докшыцкай дзіцячай бібліятэцы** дзейнічае Духоўна-культурны цэнтр *”Добрае слова“*. На базе бібліятэкі займаецца нядзельная школа прыхода храма Пакрова Прасвятой Багародзіцы. На працягу года ў рамках работы цэнтра былі рэалізаваны два праекты *”Праваслаўныя святы“* і *”Праваслаўе – мудрасць жыцця“*. Да 1030-годдзя Праваслаўя на беларускіх землях у бібліятэцы былі афармлены тэматычныя выставы, распрацавана завочнае падарожжа *”Храмы Докшыцкага краю: гісторыя і сучаснасць“*. Слыннай даце быў прысвечаны Фестываль праваслаўнай моладзі *”Пакуль мы маладыя“*, у падрыхтоўцы і правядзенні якога прымала



| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | E-mail: child.poslib@gmail.com |
| **Сенненская ЦБС** | | | | | |
| Гарбачова Таццяна Рыгораўна | Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1 | аўт. – пт. 8.00–18.00 сб. – нд. 9.00–13.00 14.00–18.00 | панядзелак | апошні чацвер месяца | 211117 г. Сянно, вул. Савецкая, 13 Тэлефон: 8-02135-4-10-76 E-mail: detbibsenno@yandex.by |
| **Талачынская ЦБС** | | | | | |
| Жанткоўская Вольга Аляксандраўна | Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 | 10.00–19.00 | панядзелак | апошні чацвер месяца | 211092 г. Талачын, вул. Набярэжная, 14 Тэлефон: 8-02136-5-24-97 E-mail: detskibibltol@yandex.by |
| **Чашніцкая ЦБС** | | | | | |
| Рубан Галіна Іванаўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 8.00–19.00 | пятніца | апошні чацвер месяца | 211149 г. Чашнікі, вул. Ленінская,10а Тэлефон: 8-02133-4-11-45 E-mail: detbib134@gmail.com |
| Казінец Галіна Цімафееўна | Новалукомльская дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 | 9.00–19.00 | пятніца | апошні чацвер месяца | 211162 Чашніцкі раён, г. Новалукомль, вул. Набярэжная,13 Тэлефон: 8-02133-3-45-93 E-mail: z6080156@gmail.com |
| **Шаркаўшчынская ЦБС** | | | | | |
| Паляк Тамара Эдвардаўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | пн. – чц. 9.0 –18.00 сб. – нд. 9.00–18.00 абед 13.00–14.00 | пятніца | апошні чацвер месяца | г.п. Шаркаўшчына, вул. Камсамольская,8 Тэлефон: 8-02154-6-19-18 E-mail: db-shark@yandex.by |
| **Шумілінская ЦБС** | | | | | |
| Бароўкіна Анжаліка Анатольеўна | Дзіцячая бібліятэка | аўт. – пт. 08.00–19.00 сб. – нд. 10.00–19.00 | панядзелак | апошняя пятніца месяца | 211259 г.п. Шуміліна, вул. Ленінская,17 Тэлефон: 8-02130-5-73-85 E-mail: Biblioteka111@mail.ru |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лепельская ЦБС** | | | | | |
| Доўнер Вольга Мікалаеўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | пн. – пт. 10.00–19.00 сб. – нд. 10.00–18.00 | без выхадных | першы чацвер месяца | 211174 г. Лепель, вул. Лабанка, .35 Тэлефон: 8-02132-3-62-50 E-mail: lepeldb@mail.ru |
| **Мёрская ЦБС** | | | | | |
| Пальчэх Святлана Леанідаўна | Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка | аўт. – нд. 9.00–18.00 | панядзелак | апошні чацвер месяца | 211287 г. Мёры, вул. Горкага,5 Тэлефон: 8-02152-4-16-24 E-mail: miori.det.bibl@yandex.ru |
| **Аршанская ЦБС** | | | | | |
| Савіцкая Наталля Анатольеўна | Дзіцячая бібліятэка імя У.Караткевіча, філіял № 1 | 10.00–19.00 | панядзелак | апошні дзень месяца | г. Орша, вул. Леніна,6а Тэлефон: 8-0216-51-16-49 E-mail: bibliotekakorotkevicha@mail.ru |
| Палітава Жанна Анатольеўна | Дзіцячая бібліятэка імя Н. Крупскай, філіял № 8 | 10.00–19.00 | пятніца | апошні дзень месяца | г. Орша, вул. Івана Чарняхоўскага,5а Тэлефон: 8-0216-51-30-40 E-mail: biblioteka.n.krupskoy@mail.ru |
| **Полацкая РЦБС** | | | | | |
| Бандарэнка Вольга Уладзіміраўна | Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1 | пн. – сб. 10.00–19.00 | нядзеля | апошні дзень месяца | 211401 г. Полацк, вул. Свярдлова,17 Тэлефон: 8-0214-46-26-33 E-mail: detbibl.tolstoy@mail.ru |
| Еўдакімава Валянціна Леанідаўна | Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 | аўт. – сб. 10.00–19.00 | нядзеля, панядзелак | апошні дзень месяца | 211406 г. Полацк, вул. Ленінградская, 47а Тэлефон: 8-0214-46-29-63 E-mail: library.office6@gmail.com |
| **Пастаўская ЦБС** | | | | | |
| Іванова Марына Мікалаеўна | Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі – філіял № 1 | пн. – чц. 10.00–19.00 сб. – нд. 10.00–18.00 | пятніца | апошняя серада месяца | 211875 г. Паставы, пл. Леніна, д.21а Тэлефон: 8-02155-2-36-62 |



ўдзел дзіцячая бібліятэка. На працягу года сумесна з нядзельнай школай прайшлі бібліясустрэча *”Ражство Хрыстова“*, духоўная гадзіна да Дня праваслаўнай кнігі *”Слова Праваслаўнае“*, духоўная сустрэча *”Последний день перед постом“*, пасхальны ранішнік *”Хваліце Госпада з нябёс. Хрыстос Уваскрэс“*, духоўная сустрэча *”Ціхі подзвіг любові“*.

Цыкл мерапрыемстваў, які быў прысвечаны 110-годдзю з дня асвячэння Свята-Успенскага касцёла, прайшоў у **дзіцячай бібліятэцы Шаркаўшчынскай ЦБС** і быў напоўнены праглядам відэафільма *”І льецца звон“*, першы паказ якога быў прымеркаваны да святкавання 1030-годдзя Полацкай епархіі на зямлі Шаркаўшчынскай; прэзентацыяй кнігі *”Што Бог пашле, тое і буду цярпець…“*, прысвечанай жыццю і подзвігу святара Канстанціна Жданава, прэзбітэра Шаркаўшчынскага.

Духоўна-маральнае выхаванне падрастаючага пакалення стала адной з найважнейшых задач **Новалукомльскай дзіцячай бібліятэкі Чашніцкай РЦБС** у межах дзейнасці клуба духоўнай асветы *”Благодать“*. Мерапрыемствы праводзяцца сумесна з настаяцелем храма Свяшчэннапакутніка Уладзіміра г. Новалукомля Віцебскай Епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы протаіерэем Аляксеем Шаура. У справаздачным годзе былі арганізаваны каляднае свята *”Святое Раство радасць прынясло“*, духоўна-асветніцкая гутарка *”Святыя Пётр і Фяўронія – заступнікі сям’і“*, духоўны форум *”Спяшайцеся рабіць дабро!“*

Супрацоўнікі **бібліятэкі імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска** прынялі ўдзел у Міжнародным праваслаўным фестывалі *”Радость“* з інтэрактыўнай гутаркай *”Дети Брестской крепости“*.

Дапамагчы чытачам разабрацца ў сутнасці хрысціянскага вучэння, атрымаць адказы на шматлікія пытанні дапамагалі кніжна-ілюстрацыйныя выставы: *”З неба ліўся прамень зоркі“*, *”Вялікі дзень! Светлы дзень!“*, *”Пад зоркай Еўфрасінні“*, *”Мір з Богам“* (**Докшыцкая дзіцячая бібліятэка**); *”Залаты ключык духоўнасці – праваслаўная кніга“*, *”Праваслаўныя святыні краю“*, *”Да душы сваёй знайдзі дарогу“* (**дзіцячая бібліятэка Чашніцкай РЦБС**).

## Арганізацыя вольнага часу

Самым значным мерапрыемствам справаздачнага года стала квэст-гульня *”Бібліязмярканне-2022“*, падрыхтаваная сумеснымі намаганнямі **дзіцячай і цэнтральнай раённай бібліятэкамі Докшыцкай ЦБС**. Яна палюбілася дзецям і вось ужо ў шосты раз сабрала самых актыўных чытачоў. Бібліятэкары прапанавалі ўдзельнікам квэст *”Магия книги“* з гульнявымі пляцоўкамі *”Зашифрованные книги“*, *”Литературный фоторобот“*, *”Тёмная комната“*, *”Загадай-ка“*, *”Книжный смайл-парад“*.

У **дзіцячай бібліятэцы імя У. Караткевіча Аршанскай ЦБС** адбыўся дванаццаты *”Нясумны вечар у бібліятэцы“*, які прайшоў у рамках святкавання Дня бібліятэк Беларусі. Для гасцей было арганізавана восем тэматычных пакояў па кнігах пісьменнікаў-землякоў, а ў дворыку адбылося

выступленне творчых калектываў. Сапраўдным падарункам усім гасцям стаў удзел у свяце Сяргея і Галіны Трафімавых. У мерапрыемстве прынялі ўдзел 440 дзяцей і падлеткаў.

У Цэнтры чытання і актыўнай творчасці *”Бібліяпазл“* **дзіцячай бібліятэкі імя Л. Талстога Полацкай РЦБС** адбылося свята-прысвячэнне *”Мы на свеце лепш за ўсіх“*. Ён аб’яднаў у сабе дзве важныя для Цэнтра падзеі: выпускны вечар для хлопчыкаў і дзяўчынак, якія наведвалі заняткі творчай майстэрні *”Казачная геаграфія“* і 5-годдзе *”Бібліяпазла“*, заснаванага ў 2017 годзе. Павіншаваць выпускнікоў са святам прыйшлі літаратурныя героі. Разам з імі хлопчыкі і дзяўчынкі расшыфроўвалі казачныя эмодзі, адказвалі на пытанні віктарыны, дзяліліся сваім выдатным настроем і талентамі. Ушанаванне выпускнікоў завяршылася ўручэннем імянных медалёў выпускніка *”Бібліяпазл“*.

Супрацоўнікі **сектара па абслугоўванні дзіцячага чытача цэнтральнай раённай бібліятэкі Дубровенскай ЦБС** правялі *”Бенефіс чытача“*. У пачатку мерапрыемства дзеці адправіліся ў займальнае падарожжа разам з казачнымі героямі. Хлопчыкі і дзяўчынкі супернічалі ў хітрасці і спрыце, перамагалі зло, праяўлялі смеласць, рашучасць і кемлівасць, змагаліся за справядлівасць. Скончылася сустрэча ўрачыстым узнагароджаннем лепшых чытачоў бібліятэкі паводле вынікаў 2021 года па наступных намінацыях: *”Самы чытаючы клас“*, *”Кніжны гурман“*, *”Прыхільнікам неверагодных гісторый“*, *”Лідэр чытальнай залы“* і інш. Ім былі ўручаны дыпломы і салодкія прызы.

Для кожнай дзіцячай бібліятэкі лета – гэта ўнікальная магчымасць стварэння для дзяцей яркіх, маляўнічых, пазнавальных і цікавых мерапрыемстваў. Бібліятэкі актыўна супрацоўнічаюць з летнімі аздараўленчымі і прышкольнымі лагерамі ў частцы правядзення масавых мерапрыемстваў самай рознай тэматыкі, як сур’ёзнай пазнавальнай, так і забаўляльнай, без якіх немагчыма ўявіць летнія канікулы. На працягу чэрвеня-жніўня 2022 года публічныя біліятэкі ажыццяўлялі цеснае супрацоўніцтва з 332 летнімі лагерамі. З удзелам дзяцей было праведзена 1969 масавых мерапрыемства, у т.л. 520 у дзіцячых бібліятэках.

Дзіцячымі бібліятэкамі Віцебскай вобласці ў 2022 годзе рэалізавана 21 праграма летніх чытанняў: *”Каб не сумна было летам, мы ідзём у бібліятэку“* **(дзіцячая раённая бібліятэка Бешанковіцкай ЦБС)**, *”У кнізе няма канікулаў“* **(дзіцячая бібліятэка ЦБС Браслаўскага раёна)**, *”Чароўны ключык у краіну ведаў“* **(бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска)**, *”Чытаючае дзяцінства“* **(Докшыцкая дзіцячая бібліятэка)**, *”Летнія канікулы 2022“* **(дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка)** і г.д.

Адным з найбольш значных і маштабных праектаў у дні работы летніх школьных лагераў у **Аршанскім раёне** стаў праект свята-гарэза *”Лета, сяброўства, сто ўсмешак“*, якое было падрыхтавана сіламі супрацоўнікаў **цэнтральнай бібліятэкі і дзіцячых бібліятэк**. Мерапрыемства ўключала яркую тэатралізаваную гульнявую праграму і блок, прысвечаны правілам бяспечных паводзін падчас летніх канікулаў.





## Кантактныя дадзеныя

| Загадчык | Назва бібліятэкі | Час працы | Выхадны дзень | Сан-дзень | Кантакты |
|---|---|---|---|---|---|
| **Бешанковіцкая ЦБС** | | | | | |
| Любачка Людміла Анатольеўна | Філіял ”Дзіцячая раённая бібліятэка“ | 9.00–13.00 14.00– 8.00 | Пятніца, 2-гі па графіку | апошні чацвер месяца | 211361 г.п. Бешанковічы, вул. Камуністычная, 12 Тэлефон: 8-02131-6-51-30 E-mail: besh_drb@beshenkovichi.gov.by |
| **Браслаўская ЦБС** | | | | | |
| Кірчанка Валянціна Яўгенаўна | Дзіцячая бібліятэка | пн. – пт. 8.00–19.00 сб., нд. 10.00–19.00 | без выхадных | апошні чацвер месяца | 211969 г. Браслаў, вул. Савецкая, 108 Тэлефон: 8-02153-6-21-03 E-mail: detbibl-braslav@yandex.by |
| **Верхнядзвінская ЦБС** | | | | | |
| Марачкоўская Вікторыя Мікалаеўна | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | 9.00–18.00 сб., нд: 9.00–18.00, перапынак: 13.00–14.00 | без выхадных | апошні чацвер месяца | 211631 г. Верхнядзвінск, вул. Савецкая, 34 Тэлефон: 8-02151-6-25-78 E-mail: dbibl-dvinsk@ vitobl.by |
| **Глыбоцкая ЦБС** | | | | | |
| Андрыеўская Таццяна Іванаўна | Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | аўт. – пт. 9.00 – 18.30 сб., нд. 9.00 – 17.00 | панядзелак | апошні чарвер месяца | 211800 г. Глыбокае, вул. Энгельса,41а Тэлефон: 8-02156-2-38-61 8-02156-2-17-43 |
| Каляга Аксана Іосіфаўна | Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 | летні перыяд 10.00–19.00 перапынак 14.00–15.00 зімні перыяд 9.00–18.00 перапынак 13.00–14.00 | панядзелак | апошняя субота месяца | 211797 Глыбоцкі р-н, г.п. Падсвільле, вул. Юбілейная,89 Тэлефон: 8-02156-3-07-57 E-mail: bibl89@tut.by |
| **Докшыцкая ЦБС** | | | | | |
| Гудзь Алена Уладзіміраўна | Докшыцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | аўт. – нд. 10.00–19.00 | панядзелак | другая пятніца месяца | 211720 г. Докшыцы, вул. Ленінская,14 Тэлефон: 8-02157-5-51-72 E-mail: dokdetlib@mail.ru |

*Працяг табліцы*

| № | ЦБС | Чытальнасць | | Абарачальнасць | | Наведвальнасць | | Колькасць бібліятэчных работнікаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2021 | 2022 | 2021 | 2022 | 2021 | 2022 | Усяго |
| 1 | Бешанковіцкая | 17,1 | 17,2 | 1,3 | 1,3 | 7,7 | 7,8 | 3 |
| 2 | Браслаўская | 17,6 | 17,2 | 1,0 | 1,0 | 7,7 | 7,6 | 4 |
| 3 | Верхнядзвінская | 18,1 | 18,5 | 2,1 | 2,2 | 5,7 | 6,4 | 3 |
| 4 | Глыбоцкая | 19,4 | 19,5 | 1,7 | 1,7 | 8,1 | 8,0 | 7 |
| 5 | Докшыцкая | 16,2 | 16,6 | 1,7 | 1,6 | 8,5 | 6,9 | 4 |
| 6 | Лепельская | 21,5 | 21,7 | 2,7 | 2,7 | 8,6 | 9,2 | 6 |
| 7 | Мёрская | 14,4 | 15,1 | 1,5 | 1,5 | 6,6 | 7,3 | 5 |
| 8 | Аршанская | 19,8 | 19,9 | 1,7 | 1,8 | 6,1 | 6,1 | 12 |
| 9 | Полацкая | 18,0 | 17,5 | 2,4 | 2,4 | 7,6 | 7,4 | 13 |
| 10 | Пастаўская | 18,0 | 18,1 | 1,3 | 1,2 | 8,0 | 8,9 | 5 |
| 11 | Расонская | 18,3 | 14,5 | 1,2 | 0 | 7,1 | 5,6 | 0 |
| 12 | Сенненская | 19,5 | 19,0 | 1,5 | 1,5 | 10,4 | 10,4 | 3 |
| 13 | Талачынская | 19,9 | 20,3 | 1,9 | 1,9 | 8,3 | 8,4 | 2 |
| 14 | Чашніцкая | 20,2 | 18,5 | 1,8 | 1,5 | 8,2 | 8,2 | 8 |
| 15 | Шаркаўшчынская | 14,9 | 14,9 | 1,3 | 1,3 | 8,0 | 8,0 | 3 |
| 16 | Шумілінская | 20,6 | 20,0 | 3,1 | 2,6 | 11,8 | 12,0 | 3 |
| | **Усяго па РЦБС** | **18,7** | **18,4** | **1,7** | **1,7** | **7,8** | **7,8** | **81** |
| 17 | г. Віцебск | 13,9 | 15,0 | 1,2 | 1,3 | 6,4 | 7,1 | 27 |
| 18 | г. Наваполацк | 19,0 | 15,2 | 1,5 | 1,2 | 6,6 | 6,9 | 12 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **15,6** | **15,0** | **1,3** | **1,3** | **6,5** | **7,0** | **39** |
| | **УСЯГО** | **17,5** | **17,0** | **1,6** | **1,5** | **7,2** | **7,5** | **120** |



Усяго ў рамках праекта ў гарадскіх і сельскіх школах і бібліятэках праведзена 14 яркіх прадстаўленняў. Удзельнікамі мерапрыемстваў сталі больш за 460 хлопчыкаў і дзяўчынак.

Працягвалася рэалізацыя праекта **Сенненскай ЦБС** *”Бібліятэка пад адкрытым небам. Кніга пад сонцам“*, у рамках якога былі арганізаваны мерапрыемствы на адкрытых пляцоўках горада і раёна: штотыднёвыя бібліятэчныя дворыкі, летнія чытанні ў цэнтральным парку, забаўляльныя праграмы *”Мы разам з кнігай па жыцці крочым“*, *”Планета цікавых канікулаў“*. Дзеці ўдзельнічалі таксама ў кніжным марафоне *”Выходзь чытаць у двор“* і квэст-гульнях. Уся праграмна-праектная дзейнасць была накіравана на арганізацыю змястоўнага вольнага часу дзяцей у перыяд летніх канікулаў, а таксама на падтрымку і развіццё цікавасці да чытання.

Тэматычны змест масавых мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў рамках праграм летніх чытанняў-2022 на працягу чэрвеня-жніўня, былі напоўнены разнастайнымі формамі бібліятэчнай работы, сярод іх забаўляльная пляцоўка *”Игроленд“* **(дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка)**, гульнявая праграма *”Чароўная краіна дзяцінства“* **(гарадская дзіцячая бібліятэка Талачынскай ЦБС)**, літаратурнае падарожжа *”Путешествие в мир книги“* **(бібліятэка імя М. Лынькова ЦБС г. Віцебска)**, гульнёва-забаўляльная праграма *”Кубик чудес“* **(дзіцячая бібліятэка Верхнядзвінскай ЦБС)**, літаратурны коктэйль *”Где-то в тридесятом царстве тридевятом государстве“* **(дзіцячая бібліятэка Лепельскай ЦБС)** і г.д.

## Арганізацыя работы дзіцячых бібліятэк з сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва

Значнае месца ў арганізацыі работы **дзіцячай бібліятэкі Сенненскай ЦБС** у рамках праграмы *”Міласэрнасць“* адведзена абслугоўванню сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва, у тым ліку дзяцей. Дзіцячая бібліятэка працуе ў цесным кантакце з Цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, органамі мясцовай улады, праводзіць маніторынгі сваёй зоны абслугоўвання, па выніках якіх мае звесткі аб колькасці дзяцей-сірот, дзецях-інвалідах, шматдзетных сем’ях, што дапамагае ўдасканальванню надомнага абслугоўвання гэтай катэгорыі карыстальнікаў. Паслугамі біблятэкі карыстаюцца 12 дзяцей-інвалідаў. Для іх праводзіліся мерапрыемствы з элементамі гульні або тэатралізацыі, такія як: *”Детству солнце подарите“*, *”Мир детства – самый лучший мир“*, *”У краіне вясёлага дзяцінства“* і лялечныя спектаклі *”Чистюля Колобок“*, *”Летняя сказка“*.

**Бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Віцебска** ў рамках праекта *”Доброе сердце“* прадугледжвае правядзенне дасугавых і культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў для людзей з інваліднасцю, якія наведваюць аддзяленне дзённага знаходжання тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Віцебска. У справаздачным годзе для іх прайшло 16 мерапрыемстваў, такіх як набат

памяці *”Нам жить и помнить“*, інтэрактыўная гадзіна *”В службе – честь“*, гадзіна экалогіі *”У природы есть друзья! Это мы – и ты, и я!“*, лялечны спектакль *”Мы хотим, чтоб ваше лето было книгами согрето!“*, гадзіна перыёдыкі *”Про всё интересное на свете, узнай в журнале и газете“*, квэст-гульня *”Безопасность в быту, или Один дома“*.

Напярэдадні Міжнароднага дня абароны дзяцей супрацоўнікі **дзіцячай бібліятэкі імя А. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка** наведалі дзіцячую паліклініку і павіншавалі са святам дзяцей аддзялення рэабілітацыі. Вясёлыя конкурсы, гульні, забавы з Бабай Ягой і падарункамі зрабілі свята незабыўным. А ў рамках праграмы *”Дорога добра“* **дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка** пазнаёміла выхаванцаў Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі г. Наваполацка з маляўнічым і чароўным светам дзіцячых кніг.

## Прафарыентацыя

Бібліятэка з шырокімі магчымасцямі папулярызацыі разнастайнай літаратуры можа многае зрабіць і дапамагчы ў выбары будучай прафесіі і стварыць умовы, якія максімальна палягчаюць прафесійнае самавызначэнне. Вынікам працы ў гэтым напрамку сталі разнастайныя формы і метады мерапрыемстваў прафарыентацыйнай накіраванасці.

У гэтым накірунку плённа працуе **дзіцячая бібліятэка Верхнядзвінскай ЦБС**. У рамках Тыдня прафарыентацыі для падлеткаў былі праведзены інфармацыйныя гадзіны, адукацыйныя квэсты, урокі прафарыетацыі такія як *”Город профессий“*, *”Школа юного библиотекаря“*, *”Тысяча профессий и одно призвание“*, *”Профессий вереница на книжных страницах“*. **Дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка** ў 2022 годзе распачала цыкл мерапрыемстваў па прафарыентацыі *”Выбар прафесіі – выбар будучыні“*. Для вучняў старэйшых класаў школ г. Наваполацка арганізоўваліся сустрэчы з выкладчыкамі кафедр архітэктуры і дызайну, фізічнай культуры, геадэзіі і геаінфармацыйных сістэм Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай. Выкладчыкі распавядалі пра спецыяльнасці сваіх кафедр, давалі парады, як пабудаваць сваю індывідуальную траекторыю развіцця, абіраючы для навучання адну з 50 спецыяльнасцяў, што прапаноўваюцца на 7 факультэтах ВНУ. З мэтай папулярызацыі прафесіі, напярэдадні прафесійнага свята Дня выратавальніка, **дзіцячая бібліятэка Шаркаўшчынскай ЦБС** для навучэнцаў ДУА ”Шаркаўшчынская сярэдняя школа № 1 г.п. Шаркаўшчына“ арганізавала сустрэчу з супрацоўнікамі Шаркаўшчынскага РАНС. Яны расказалі аб беларускай службе выратавання і параілі звязаць свой лёс са службай у РАНС. Для гэтага дзяцей пазнаёмілі з Полацкім дзяржаўным хіміка-тэхналагічным каледжам, дзе можна атрымаць спецыяльнасць тэхніка па папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, а таксама прадэманстравалі відэафільм аб Гомельскім ліцэі МНС.





| № | ЦБС | Бібліятэчны фонд (экз.) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | | | Пасту піла 2022 | Выбыла 2022 | % абн. фонду |
| | | 2021 | 2022 | +/- | | | |
| 1 | Бешанковіцкая | 20573 | 20766 | 193 | 506 | 313 | 2,4 |
| 2 | Браслаўская | 33718 | 33733 | 15 | 549 | 534 | 1,6 |
| 3 | Верхнядзвінская | 13186 | 12748 | -438 | 761 | 1201 | 6,0 |
| 4 | Глыбоцкая | 37063 | 37518 | 455 | 1379 | 924 | 3,7 |
| 5 | Докшыцкая | 20536 | 21432 | 896 | 752 | 313 | 3,5 |
| 6 | Лепельская | 22082 | 21787 | -295 | 916 | 1288 | 4,2 |
| 7 | Мёрская | 21134 | 21121 | -13 | 707 | 720 | 3,3 |
| 8 | Аршанская | 90246 | 85047 | -5199 | 2175 | 7374 | 2,6 |
| 9 | Полацкая | 45151 | 44553 | -598 | 2412 | 3010 | 5,4 |
| 10 | Пастаўская | 29985 | 30896 | 911 | 1412 | 501 | 4,6 |
| 11 | Расонская | 15409 | 0 | -15409 | 294 | 15703 | 0 |
| 12 | Сенненская | 20790 | 20608 | -182 | 797 | 979 | 3,9 |
| 13 | Талачынская | 18575 | 18917 | 342 | 833 | 491 | 4,4 |
| 14 | Чашніцкая | 64734 | 61684 | -3050 | 1864 | 4966 | 3,0 |
| 15 | Шаркаўшчынская | 18348 | 18427 | 79 | 631 | 826 | 3,4 |
| 16 | Шумілінская | 10410 | 11530 | 1120 | 673 | 126 | 5,8 |
| | **Усяго па РЦБС** | **481940** | **460767** | **-21173** | **16661** | **39269** | **3,6** |
| 17 | г. Віцебск | 225319 | 229403 | 4084 | 5872 | 1788 | 2,6 |
| 18 | г. Наваполацк | 123601 | 121370 | -2231 | 3563 | 5794 | 2,9 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **348920** | **350773** | **1853** | **9435** | **7582** | **2,7** |
| | **УСЯГО** | **830860** | **811540** | **-19320** | **26096** | **46851** | **3,2** |

| № | ЦБС | Наведванні | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2021 | План 2022 | 2022 | % | + / - |
| 1 | Бешанковіцкая | 12465 | 12465 | 12576 | 100,9 | 111 |
| 2 | Браслаўская | 14991 | 15200 | 15273 | 100,5 | 282 |
| 3 | Верхнядзвінская | 8947 | 8800 | 9743 | 110,7 | 796 |
| 4 | Глыбоцкая | 25606 | 24800 | 25329 | 102,1 | -277 |
| 5 | Докшыцкая | 18341 | 18300 | 14606 | 79,8 | -3735 |
| 6 | Лепельская | 24000 | 24720 | 25345 | 102,5 | 1345 |
| 7 | Мёрская | 14848 | 15000 | 15746 | 105,0 | 898 |
| 8 | Аршанская | 46268 | 45200 | 45989 | 101,7 | -279 |
| 9 | Полацкая | 46276 | 41100 | 45295 | 110,2 | -981 |
| 10 | Пастаўская | 17050 | 18700 | 18737 | 100,2 | 1687 |
| 11 | Расонская | 6984 | 6900 | 3634 | 52,7 | -3350 |
| 12 | Сенненская | 16665 | 16600 | 16603 | 100,0 | -62 |
| 13 | Талачынская | 15094 | 14400 | 15194 | 105,5 | 100 |
| 14 | Чашніцкая | 46235 | 40425 | 41214 | 102,0 | -5021 |
| 15 | Шаркаўшчынская | 12691 | 12600 | 12687 | 100,7 | -4 |
| 16 | Шумілінская | 18299 | 18200 | 18266 | 100,4 | -33 |
| | **Усяго па РЦБС** | **344760** | **333410** | **336237** | **100,8** | **-8523** |
| 17 | г. Віцебск | 128040 | 138910 | 142504 | 102,6 | 14464 |
| 18 | г. Наваполацк | 65732 | 68020 | 68021 | 100,0 | 2289 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **193772** | **206930** | **210525** | **101,7** | **16753** |
| | **УСЯГО** | **538532** | **540340** | **546762** | **101,2** | **8230** |



## Прававое выхаванне

Дзіцячыя бібліятэкі Віцебскай вобласці вядуць мэтанакіраваную і сістэматычную дзейнасць па фарміраванні высокага ўзроўню прававой культуры дзяцей і падлеткаў. Трэба адзначыць, што на базе дзіцячых бібліятэк працуюць 4 ПЦПІ.

У справаздачным годзе бібліятэкі актыўна займаліся рэалізацыяй праектаў і праграм прававой тэматыкі: *”Расці ў бяспецы“, ”Закон вывучаюць дзеці“* (**дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога Полацкай РЦБС**), *”Табе аб праве і права аб табе“* (**дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка**), *”Крок наперад“* (**Докшыцкая дзіцячая бібліятэка сумесна з камісіяй па справах непаўналетніх**).

Трэба адзначыць, што для падрыхтоўкі і правядзення прававых мерапрыемстваў, адрасаваных дзецям і падлеткам, бібліятэкі Віцебскай вобласці наладзілі партнёрскія адносіны з супрацоўнікамі аддзелаў па справах моладзі, пракуратуры, ваенкаматаў, з прадстаўнікамі праваахоўных органаў. Так, у **дзіцячай бібліятэцы ЦБС Браслаўскага раёна** для падлеткаў прайшла тэматычная сустрэча з участковым інспектарам па справах непаўналетніх Т. Дарафеевай *”Крымінальная і адміністрацыйная адказнасць падлеткаў“*. На прававую асвету навучэнцаў быў накіраваны круглы стол *”СТОП-гвалт!“*, які адбыўся ў **дзіцячай бібліятэцы Чашніцкай РЦБС** з удзелам інспектара Інспекцыі па справах непаўналетніх Чашніцкага РАУС Р. Камадэй. **Дзіцячая бібліятэка імя Н. Крупскай Аршанскай ЦБС** у рамках адукацыйнага праекта ”Тэрыторыя бяспечнага дзяцінства“ правяла школу бяспекі для школьнікаў *”Аб бяспецы памятай заўсёды, каб не здарылася з табою бяда“* з удзелам інспектара аддзела прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Аршанскага гаррайаддзела па НС Ю. Алесіна.

Неабходна падкрэсліць, што формы мерапрыемстваў, якія праводзяцца, падбіраюцца бібліятэкарамі з улікам узроставых асаблівасцей аўдыторыі, на якую разлічана інфармацыя. Выбар робіцца на яркія, відовішчныя мерапрыемствы, якія прадугледжваюць актыўнае прыцягненне ўсіх удзельнікаў. Так, **дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка** правяла інфармацыйна-забаўляльнае мерапрыемства *”Інтэрнэт-гігіена“*. Сустрэча была прысвечана інтэрнэт-пісьменнасці і інтэрнэт-бяспецы. Дзецям расказалі аб плюсах і мінусах віртуальнага свету, аб пагрозах і правілах паводзін у сетцы інтэрнэт. **Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка** арганізавала гульнявую праграму *”Правы дзіцяці ў казках“*. На прыкладзе казак дзеці пазнаёміліся з прававымі нормамі. Так з казкі *”Тры парасяці“* дзеці засвоілі права на жыллё, з казак *”Чырвоная Шапачка“* і *”Воўк і сямёра казлянят“* – права на жыццё, з казкі *”Бураціна“* – права на адукацыю, *”Папялушка“* – права на адпачынак. Падчас гульні юныя чытачы павінны былі прадставіць сябе ў ролі юрыстаў і даць параду таму ці іншаму літаратурнаму герою, спасылаючыся на Канвенцыю аб правах дзіцяці.

З мэтай інфармавання падрастаючага пакалення аб правах і абавязках грамадзян Рэспублікі Беларусь, паглыблення ведаў аб асноўным законе краіны – Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у рамках мерапрыемстваў былі праведзены прававы ўрок *"Падарожжа па старонках Канстытуцыі"* (**Расонская дзіцячая бібліятэка**), прававая трыбуна *"Канстытуцыйнае права – выбіраць і быць абраным"* (**дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога Полацкай РЦБС**).

Дзіцячымі бібліятэкамі вобласці актыўна рэалізоўваліся мерапрыемствы па папулярызацыі дзяржаўнай сімволікі, якія станоўча ўплываюць на станаўленне грамадзянскай пазіцыі маладога пакалення: пазнавальная гадзіна *"Сімвалы Беларусі"* (**бібліятэка імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска**), *"Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь"* (**Расонская дзіцячая бібліятэка**).

З мэтай фарміравання ў дзяцей-удзельнікаў дарожнага руху навыкаў бяспечных паводзін, актывізацыі і ўдасканалення работы па папярэджанні дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму ў дзіцячых бібліятэках Віцебскай вобласці вядзецца сістэматычная работа. У дні летніх школьных канікулаў бібліятэчнымі ўстановамі былі праведзены розныя мерапрыемствы, у працэсе якіх замацоўваліся і фарміраваліся веды аб правілах дарожнага руху. У рамках акцыі *"Увага – дзеці!"* адбыўся ўрок дарожнай азбукі *"Для ўсіх без выключэння ёсць правілы руху"* **дзіцячай бібліятэкі імя С. Маршака ЦБС г. Наваполацка**. Дзяцей чакала сустрэча з героем мерапрыемства Тарапыжкам, які пазнаёміў сваіх маленькіх сяброў з правіламі дарожнай бяспекі, расказаў пра дарожныя знакі і паказаў, як працуе святлафор, і навошта трэба насіць у цёмны час святлоадбівальны элемент. **Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка** правяла дарожны практыкум *"Мы ідзём з табой па "зебры"* у ходзе якога дзеці паглядзелі навучальны фільм аб правах і абавязках пешаходаў і адказалі на пытанні віктарыны.

Прававой тэматыцы былі прысвечаны кніжныя выставы і тэматычныя паліцы: *"Закон – правіла, па якім мы жывем"* (**Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка**), *"З чаго пачынаецца Радзіма"* (**Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка**), *"Галоўны закон краіны"* (**дзіцячая бібліятэка Чашніцкай РЦБС**).

Практычна кожнае мерапрыемства, накіраванае на павышэнне прававой культуры і інфармаванасці насіла комплексны характар і давала магчымасць набываць шырокія веды ў галіне права, неабходныя ў паўсядзённым жыцці.

## Міжнароднае супрацоўніцтва

Загадчык **дзіцячай бібліятэкі імя А. Пушкіна ЦБС г. Наваполацка** Таццяна Варанец прыняла ўдзел у II Усерасійскай навукова-практычнай анлайн-канферэнцыі *"Детская и подростковая литература: подходы к анализу, практики чтения, региональный контекст изучения"*, прысвечанай 120-годдзю Томскага дзяржаўнага





| № | ЦБС | Дакументавыдача | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2021 | План 2022 | 2022 | % | + / - |
| 1 | Бешанковіцкая | 27536 | 27500 | 27787 | 101,0 | 251 |
| 2 | Браслаўская | 34387 | 34500 | 34557 | 100,2 | 170 |
| 3 | Верхнядзвінская | 28259 | 28200 | 28276 | 100,3 | 17 |
| 4 | Глыбоцкая | 61181 | 60800 | 62020 | 102,0 | 839 |
| 5 | Докшыцкая | 35007 | 35000 | 35007 | 100,0 | 0 |
| 6 | Лепельская | 59543 | 58000 | 59840 | 103,2 | 297 |
| 7 | Мёрская | 32609 | 32000 | 32582 | 101,8 | -27 |
| 8 | Аршанская | 149232 | 147500 | 149798 | 101,6 | 566 |
| 9 | Полацкая | 109865 | 105000 | 107099 | 102,0 | -2766 |
| 10 | Пастаўская | 38250 | 38000 | 38089 | 100,2 | -161 |
| 11 | Расонская | 18055 | 18100 | 9414 | 52,0 | -8641 |
| 12 | Сенненская | 31263 | 30400 | 30415 | 100,0 | -848 |
| 13 | Талачынская | 36184 | 36000 | 36479 | 101,3 | 295 |
| 14 | Чашніцкая | 114394 | 92530 | 93431 | 101,0 | -20963 |
| 15 | Шаркаўшчынская | 23578 | 23000 | 23456 | 102,0 | -122 |
| 16 | Шумілінская | 32079 | 30000 | 30516 | 101,7 | -1563 |
| | **Усяго па РЦБС** | **831422** | **796530** | **798766** | **100,3** | **-32656** |
| 17 | г. Віцебск | 277487 | 297910 | 301792 | 101,3 | 24305 |
| 18 | г. Наваполацк | 188300 | 150000 | 150004 | 100,0 | -38296 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **465787** | **447910** | **451796** | **100,9** | **-13991** |
| | **УСЯГО** | **1297209** | **1244440** | **1250562** | **100,5** | **-46647** |

*Дадатак 2*

**Асноўныя паказчыкі дзейнасці дзіцячых бібліятэк Віцебскай вобласці за 2022 год**

| № | ЦБС | Сетка | Карыстальнікі | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2021 | План 2022 | 2022 | % | + / - |
| 1 | Бешанковіцкая | 1 | 1610 | 1610 | 1611 | 100,1 | 1 |
| 2 | Браслаўская | 1 | 1954 | 1950 | 2010 | 103,1 | 56 |
| 3 | Верхнядзвінская | 1 | 1558 | 1525 | 1527 | 100,1 | -31 |
| 4 | Глыбоцкая | 2 | 3151 | 3100 | 3177 | 102,5 | 26 |
| 5 | Докшыцкая | 1 | 2155 | 2100 | 2112 | 100,6 | -43 |
| 6 | Лепельская | 1 | 2775 | 2700 | 2755 | 102,0 | -20 |
| 7 | Мёрская | 1 | 2260 | 2100 | 2156 | 102,7 | -104 |
| 8 | Аршанская | 2 | 7555 | 7480 | 7516 | 100,5 | -39 |
| 9 | Полацкая | 2 | 6120 | 6100 | 6128 | 100,5 | 8 |
| 10 | Пастаўская | 1 | 2122 | 2100 | 2109 | 100,4 | -13 |
| 11 | Расонская | 0 | 986 | 1200 | 650 | 54,2 | -336 |
| 12 | Сенненская | 1 | 1600 | 1600 | 1602 | 100,1 | 2 |
| 13 | Талачынская | 1 | 1814 | 1800 | 1800 | 100,0 | -14 |
| 14 | Чашніцкая | 2 | 5658 | 4870 | 5050 | 103,7 | -608 |
| 15 | Шаркаўшчынская | 1 | 1581 | 1570 | 1579 | 100,6 | -2 |
| 16 | Шумілінская | 1 | 1555 | 1520 | 1523 | 100,2 | -32 |
| | **Усяго па РЦБС** | **19** | **44454** | **43325** | **43305** | **100,0** | **-1149** |
| 17 | г. Віцебск | 5 | 19957 | 19859 | 20173 | 101,6 | 216 |
| 18 | г. Наваполацк | 2 | 9901 | 9900 | 9900 | 100,0 | -1 |
| | **Усяго па ГЦБС** | **7** | **29858** | **29759** | **30073** | **101,1** | **215** |
| | **УСЯГО** | **26** | **74312** | **73084** | **73378** | **100,4** | **-934** |



педагагічнага ўніверсітэта (г. Томск) і выступіла з дакладам *”Беларуская чытанка“: литературный медиапроект, как способ приобщения детей к белорусской литературе“*.

Загадчык **дзіцячай бібліятэкі ЦБС Браслаўскага раёна** Валянціна Кірчанка завочна прыняла ўдзел у І Усерасійскай (з міжнародным удзелам) канферэнцыі *”Без Памяти мы не научим детей будущему“* з дакладам *”Война…Трагедия и подвиг в судьбах наших земляков“* па захаванні і перадачы памяці аб Вялікай Айчыннай вайне падрастаючаму пакаленню.

У Міжнародным фестывалі мастацтва і творчасці *”Арт-магия“* ў завочнай форме прыняла ўдзел Эвеліна Пухава, чытач **бібліятэкі-філіяла № 14 імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска**, удзельніца гуртка *”Бусляня“* з працай *”Куклы-мотанки. Коллекция ручной работы ”Деревенский хоровод“* (беларускія народныя лялькі) у катэгорыі 8-11 гадоў і атрымала Дыплом пераможцы фестывалю.

## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ. ФОТАФАКТ




”55-гадовы юбілей“
Бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака ЦБС г. Віцебска




”Бенефіс чытача“
Сектар дзіцячай літаратуры цэнтральнай раённай бібліятэкі
Дубровенскай ЦБС



| | | | |
|---|---|---|---|
| Сенненская | 1 | Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка-філіял № 1 | раённая |
| Талачынская | 1 | Гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 49 | раённая |
| Чашніцкая | 2 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1<br>Новалукомльская дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 | раённая<br>гарадская |
| Шаркаўшчынская | 1 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | раённая |
| Шумілінская | 1 | Дзіцячая бібліятэка | раённая |
| | | **ГЦБС** | |
| г. Віцебск | 5 | Бібліятэка-філіял № 9 імя С. Маршака<br>Бібліятэка-філіял № 10 імя Я. Коласа<br>Бібліятэка-філіял № 11 імя М. Лынькова<br>Бібліятэка-філіял № 12 імя М. Астроўскага<br>Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча | гарадская<br>гарадская<br>гарадская<br>гарадская<br>гарадская |
| г. Наваполацк | 2 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 3 імя С. Маршака<br>Дзіцячая бібліятэка-філіял № 4 імя А. Пушкіна | гарадская<br>гарадская |
| **Усяго** | **26** | | |

### Прафіляваныя дзіцячыя бібліятэкі Віцебскай вобласці

| № п/п | Назва ўстановы / профіль | Нумары / даты рашэнняў выканаўчых камітэтаў |
|---|---|---|
| 1 | Бібліятэка-філіял № 14 імя У. Караткевіча ЦБС г. Віцебска – цэнтр краязнаўства | Загад па ЦБС г.Віцебска № 44 “Аб прафіліраванні бібліятэк” ад 15.02.2008 г. |

## ДАДАТКІ

*Дадатак 1*

### Дзіцячыя бібліятэкі Віцебскай вобласці

| Віды дзіцячых бібліятэк | 2021 | 2022 |
|---|---|---|
| раённыя | 14 | 13 |
| гарадскія | 12 | 12 |
| гарпасялковыя | 1 | 1 |
| **Усяго** | **27** | **26** |

| ЦБС | Сетка | Афіцыйныя назвы | Від |
|---|---|---|---|
| **РЦБС** | | | |
| Бешанковіцкая | 1 | Філіял ”Дзіцячая раённая бібліятэка“ | раённая |
| Браслаўская | 1 | Дзіцячая бібліятэка | раённая |
| Верхнядзвінская | 1 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | раённая |
| Глыбоцкая | 2 | Глыбоцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1<br>Падсвільская дзіцячая бібліятэка-філіял № 2 | раённая<br>гарпасял-ковая |
| Докшыцкая | 1 | Докшыцкая дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | раённая |
| Лепельская | 1 | Дзіцячая бібліятэка-філіял № 1 | раённая |
| Мёрская | 1 | Мёрская дзіцячая раённая бібліятэка | раённая |
| Аршанская | 2 | Дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча, філіял № 1<br>Дзіцячая бібліятэка імя Н. Крупскай, філіял № 8 | гарадская<br>гарадская |
| Полацкая | 2 | Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога – філіял № 1<br>Дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы – філіял № 6 | гарадская<br>гарадская |
| Пастаўская | 1 | Раённая дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі – філіял № 1 | раённая |






Цэнтру чытання і актыўнай творчасці ”Бібліяпазл“ – 5 год
Дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога Полацкай РЦБС



Сустрэча з Тамарай Красновай-Гусачэнка
Бібліятэка імя С. Маршака ЦБС г. Віцебска




”Юбілей – 70 год“
Раённая дзіцячая бібліятэка імя У.Дубоўкі Пастаўскай ЦБС






”Юбілей – 75 год“
Дзіцячая бібліятэка Шумілінскай ЦБС